

ЯК АДЧУВАЕ СЯБЕ БЕЛАРУСКІ ЛЕГПРАМ 4

ШЛЮБНЫ ДАГАВОР ДАПАМОЖА ЗЭКАНОМІЦЬ



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 КРАСАВІКА 2020 г. ЧАЦВЕР № 64 (29178)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар ЧАЙЧЫЦ, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў:**

*«Безумоўна, у крызісныя перыяды бізнесменам даводзіцца ў чымсьці сабе адмаўляць і наладжваць работу ва ўмовах моцнай абмежаванасці. Бізнес, які працаваў сумленна ў адносінах да дзяржавы, можа і павінен у сітуацыі, якая склалася, разлічваць на падтрымку і абарону з боку дзяржавы — гэта і ёсць дапамога людзям».*

## КОРАТКА

• **Навукоўцы выявілі эфектыўныя антыцелы, здольныя блакіраваць COVID-19.**

• У Беларусі павялічаны ліміты дырэктыўнага крэдытавання дзяржпраграм у 2020 годзе.

• **Выплаты ветэранам да Дня Перамогі стартавалі 1 красавіка.**

• Памёр лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы Філіп Уорэн Андэрсан.



• **Беларускія ВНУ праводзяць дні адчыненых дзвярэй анлайн.**

• Выстаўка «Выбраныя святыя» адкрыецца 9 красавіка ў Гомелі.

• **Базавая арэндная велічыня павялічваецца да Br17,85.**

• Фестываль «Велікодная Радасць» пройдзе ў анлайн-рэжыме.

• **У БДУ адкрываецца дыстанцыйная школа юнага матэматыка.**

ISSN 1990 - 763X

# СВІСЛАЧ АЛІМПІЙСКАЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Навучэнцы Мінскай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы алімпійскага рэзерву па водных відах спорту асвойваюць трэніровачную дыстанцыю на Свіслачы.**

Падрабязнасці

# У ПЕРШЫЯ Ж ГАДЗІНЫ

### Пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй COVID-19 вельмі аператыўна шпіталізуюць пасля пацвярджэння дыягназу

**«У самы кароткі перыяд, літаральна ў першыя гадзіны з моманту атрымання станоўчага выніку на COVID-19, пацыента і яго бліжэйшыя кантакты першага ўзроўню адразу ж ізалююць і шпіталізуюць ва ўстановы аховы здароўя. Гэта дазваляе нам досыць хутка лакалізаваць ачаг», — расказвае намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ.**

### Вядзецца эпідрасследаванне

Яна растлумачыла механізм гэтай работы. Пасля атрымання лабараторнага пацвярджэння да пацыента з каранавірусам вельмі аператыўна, гаворка ідзе літаральна пра хвіліны (не важна, у які менавіта час атрыманы станоўчы вынік), выязджае спецыяльная брыгада хуткай меддапамогі. Медыкі транспартуюць чалавека ў інфекцыйны ці іншы перапрафіляваны для гэтай мэты стацыянар. Пацыент пры гэтым можа знаходзіцца і ў іншай медустанове як кантакт першага ўзроўню, і дома, зусім не маючы ніякіх праяў рэспіраторнага захворвання.

У стацыянары пачынаецца правядзенне эпідрасследавання. З пацыентам гутарыць спецыяліст, які высвятляе наяўнасць якіх-небудзь клінічных сімптомаў. Зыходзячы з атрыманай інфармацыі, вылічваецца перыяд, з якога шпіталізаваны мог пачаць выдзяляць узбуджальнік. З гэтага моманту і пачынаецца збор поўнага эпіданамнезу: з кім меў зносіны пацыент і як доўга. Калі чалавек з нейкіх прычын не цалкам расказвае пра свае кантакты, падключаюцца магчымасці іншых структур. «Гэта карпатлівая праца, апытанне і аднаўленне ўсіх кантактаў часам займае дзве і больш гадзін. Часам такое апытанне праводзіцца неаднаразова, калі спецыяліст разумее, што ў аповедзе ёсць недакладнасці», — адзначыла Ірына Глінская. СТАР. 4

Тэорыя і практыка

# «СТВАРАЕМ» СВАЕ ПЕРСІКІ, але не забываемся і пра антонаўку



Фота БелТА.

**Глабальнае пацяпленне і змяненне клімату, скарачэнне плошчы ўрадлівай зямлі і водных рэсурсаў пагражаюць нам стратай разнастайнасці генетычных рэсурсаў раслін, прыдатных для вытворчасці прадуктаў харчавання. Таму захаванне, вывучэнне і эфектыўнае выкарыстанне генафонду раслін у большасці краін свету разглядаецца як нацыянальная задача, якая служыць для ўстойлівай сельскагаспадарчай вытворчасці, расказаў генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве, акадэмік Фёдар ПРЫВАЛАЎ. Ён і іншыя спецыялісты галіны паведамілі, што робіцца ў нашай краіне для захавання і ўдасканалення жыццёва неабходнага фонду.** СТАР. 13



# НА ШЛЯХУ РАЎНАПРАЎНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

*Народам Беларусі і Расіі*

**Дарагія сябры!**

Сардэчна віншую вас з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.

Свята, якое ўпісана ў гістарычны каляндар нашых краін больш за 20 гадоў таму, увасабляе ў сабе непадробнае імкненне беларусаў і расіян працягваць слаўныя традыцыі сваіх дзядоў і бацькоў жыць у міры і згодзе, будаваць агульны трывалы дом на карысць сённяшняга і наступных пакаленняў.

За кароткі па мерках гісторыі перыяд нам удалося стварыць надзейны прававы фундамент Саюзнай дзяржавы, заснаваны на прынцыпах суверэнітэту і незалежнасці Беларусі і Расіі пры захаванні агульнасці іх шляху развіцця і непарыўнасці чалавечых лёсаў.

Мы зберaглі і прымножылі глыбокія эканамічныя сувязі. Сёння тысячы беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў удзельнічаюць у вытворчай кааперацыі, што дазваляе выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю, запатрабаваную на знешніх рынках. Гэтаму таксама спрыяюць сумесныя праекты ў навукаёмістых і высокатэхналагічных галінах.

Фарміраванне агульнага рынку працы і спадарожнай інфраструктуры значна пашырыла магчымасці прафесійнай самарэалізацыі і развіцця для грамадзян двух дзяржаў.

Інтэграцыйныя памкненні беларусаў і расіян грунтуюцца не толькі на агульных эканамічных інтарэсах і ўзаемавыгадным гандлі. Іх стрыжнем заўсёды былі, ёсць і будуць непарушнае шматгадовае сяброўства і згуртаванасць народаў, загартаваных на франтах Вялікай Айчыннай вайны, 75-годдзе Перамогі ў якой мы будзем урачыста адзначаць сёлета.

Наш святы абавязак — зберагчы і перадаць патомкам праўду пра тыя страшныя падзеі і гістарычны подзвіг савецкага народа. Маштабныя саюзныя праекты — рэканструкцыя Брэсцкай крэпасці і ўзвядзенне Ржэўскага мемарыяла савецкаму салдату — важны ўнёсак ва ўвекавечанне памяці абаронцаў Айчыны.

Цалкам зразумела і заканамерна, што сёння нашы краіны разам супрацьдзейнічаюць узнікаючым выклікам і пагрозам бяспецы, праводзячы ўзгодненую знешнюю і абаронную палітыку ў імя падтрымання міру і стабільнасці ў рэгіёне.

Намі праведзена вялікая работа. Але яшчэ шмат трэба зрабіць на шляху раўнапраўнай узаемавыгаднай інтэграцыі і ўмацавання Саюзнай дзяржавы. Паспяховасць рэалізацыі нашых планаў будзе залежаць ад няўхільнага выканання прынятых дамоўленасцяў, выключэння нацыянальнага пратэкцыянізму, скасавання існуючых бар'ераў, выключэнняў і абмежаванняў.

У нас для гэтага ёсць усё неабходнае — воля да яднання, магутная матэрыяльна-тэхнічная база, высокапрафесійныя кадры, працавітыя і таленавітыя людзі.

Ад усёй душы жадаю моцнага здароўя, міру, згоды, дабрабыту і працвітання вам і вашым сем'ям.

**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Парламенцкі дзённік

# КІРАЎНІЦТВА СААЗ ЗАПРАСІЛІ Ў МІНСК

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА па даручэнні Прэзідэнта ўчора правяла перагаворы з дырэктарам Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Хансам Клюге і пацвердзіла запрашэнне спецыялістам арганізацыі наведаць Беларусь, паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу Савета Рэспублікі.**

Шырокі спектр пытанняў — ад узаемадзеяння нашай краіны і СААЗ у цэлым да арганізацыі гэтага візіту — абмяркоўваліся ў фармаце відэаканферэнцыі. Наталля Качанава праінфармавала кіраўніцтва рэгіянальнага бюро СААЗ аб эпідэміялагічнай сітуацыі ў Беларусі, мерах, якія прымаюцца па барацьбе з каранавірусам. Яна таксама падзякавала СААЗ за цеснае супрацоўніцтва з Беларуссю.

«Мы бачым сёння мноства розных інфармацыйных укідаў і фэйкаў адносна тых мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў нас у краіне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка папрасіў перадаць вам запрашэнне для таго, каб даць рэальную ацэнку той сітуацыі, якая ў нас складваецца, рабоце нашай сістэмы аховы здароўя», — адзначыла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі дадала, што Беларусь, безумоўна, робіць усё, каб мінімізаваць наступствы распаўсюджвання віруса. «Як падкрэсліве кіраўнік дзяржавы, галоўнае для нас — гэта людзі. Мы нічога не ўтойваем. Робіцца ўсё, каб страты былі найменшыя для народа і краіны», — сказала яна.

У сваю чаргу, Ханс Клюге падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за запрашэнне. «Вельмі важна, што кіраўнік краіны настолькі ўключаны ў гэта пытанне, мне прыемна аб гэтым даведацца, — сказаў ён. — Раней я звяртаўся з лістом у Міністэрства аховы здароўя Беларусі, у якім падкрэсліў правільныя захады, што робіць беларускі ўрад. Цяпер такі момант, калі мы павінны мабілізаваць грамадства, каб пераадолець існуючую сітуацыю». Акрамя таго, Ханс Клюге паведаміў аб намеры абмеркаваць з кіраўніцтвам СААЗ пытанне накіравання экспертаў і яго асабістага візіту ў Беларусь.

Работу ў адпаведнасці з рэкамендацыямі СААЗ чарговы раз пацвердзіў у размове і краінавы прадстаўнік арганізацыі ў Беларусі Батыр Бердыклычаў.

Блізкая ўлада

# СТАРЫХ ВАЖНА СУПАКОІЦЬ

## У Савецкім раёне сталіцы ўзялі пад апеку ўсіх адзінокіх пажылых людзей

**Пра гэта паведаміў журналісту «Звязды» дэпутат, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Сяргей ДЗІК. Напярэдадні адкрыцця другой парламенцкай сесіі ён на тэрыторыі сваёй выбарчай акругі — Купалаўскай № 106 — правёў прыём грамадзян.**



«Мая галоўная мэта — паведаміць людзям ва ўзросце, што ёсць гарачая лінія ў Цэнтры сацыяльнай абароны Савецкага раёна Мінска, куды яны могуць звяртацца, асабліва адзінокія, і ім даставяць прадукты харчавання. У БДУІР ёсць 20 валанцёраў, якія працуюць з адміністрацыяй раёна. Сёння важна праінфармаваць пажылых людзей, што іх праблемы будуць вырашаны, для гэтага ім не трэба выходзіць з дому, — расказаў дэпутат. — У сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй, якая склалася ў краіне, у Савецкім раёне сталіцы працуюць мабільныя брыгады па дастаўцы прадуктаў харчавання, лекаў на дом адзінокім пажылым грамадзянам. Заяўкі прымаюцца па тэлефонах раённага і гарадскога цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання».

Па словах парламентарыя, сацыяльныя службы раёна ўзялі пад апеку ўсіх пажылых людзей, якія адзінока пражываюць на гэтай тэрыторыі сталіцы. «Да кожнага прыходзяць і з кожным гутараць, ставяць на ўлік і бяруць пад кантроль. Людзей трэба накіроўваць туды, дзе іх чакаюць, дзе дзеля іх працуюць», — лічыць Сяргей Дзік.

Парламентарый восем гадоў працаваў дэканам, сем — прарэктарам у БДУІР, ён і цяпер працягвае чытаць лекцыі для магістрантаў і аспірантаў. Кажа, што прывык мець справу з прасунутымі маладымі людзьмі, таму яго не палохаюць сустрэчы з выбаршчыкамі, з якімі б пытаннямі тыя ні звярталіся.

За некалькі месяцаў дэпутацкага вопыту ўжо давялося сутыкнуцца з прававой калізіяй, якая ўзнікае пры выкарыстанні сямейнага капіталу.

«Звычайна сямейны капітал выкарыстоўваюць, каб пагасіць жыллёвы крэдыт. Да мяне звярнулася сям'я, для якой работадаўца набыў кватэру. Іх знялі з чаргі, а грошы за кватэру яны цяпер вінны свайму работадаўцу. Штомесяц вылічваюць з заробку, у той час як яны атрымалі сямейны капітал і маглі б з яго дапамогай пагасіць доўг. Але закон не дазваляе, бо сям'я страціла статус маючай патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — падзяліўся парламентарый. — Хачу гэта пытанне абмеркаваць з прафсаюзамі. Бацькі, якія гадуюць малых дзяцей, у першую чаргу жадаюць вырашыць жыллёвае пытанне. Да аплаты вучобы ў ВНУ ім яшчэ далёка. Але гэта не заўсёды аказваецца магчыма. Мы гэта пытанне прапрацоўваем, потым выйдзем з ім на Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Яшчэ адна важная праблема для нашага раёна — веласіпедныя паркоўкі. Ёсць прапанова выдзяляць для іх на аўтамабільных паркоўках пару машынамесцаў». Парламентарый пагадзіўся, што падчас успышак вірусных інфекцый аддаваць перавагу веласіпеду перад грамадскім транспартам вельмі слушна.

«Так, гэта надзённае пытанне. Я сустракаўся з кіраўніцтвам прадпрыемства «Амкадор-Белвар», якое мае інтэрнат для сваіх супрацоўнікаў, — праблема месца для захоўвання веласіпедаў там асабліва балючая. Шмат моладзі жыве ў інтэрнаце і карыстаецца гэтым відам транспарту, карысталіся б яшчэ больш, але захоўваць няма дзе. «Белвар» гатовы сам зрабіць канструкцыі, ім патрэбна толькі месца», — рэзюмаваў Сяргей Дзік.

Ёсць у жыхароў сталіцы пытанні да якасці капітальнага рамонту і наконт яго тэрмінаў.

«Да мяне як дэпутата звярнуўся Інстытут інфармацыйных тэхналогій БДУІР з нагоды праекта закона аб інвалідах, — прывёў таксама прыклад пісьмовага звароту парламентарый. — Яны выказалі свае прапановы, мы іх разгледзелі на пасяджэнні Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях. У гэтым інстытуце на кафедры ЮНЕСКА ІТ-тэхналогіям навучаюцца інваліды, але многія іх прапановы ў праекце закона ўжо ўлічаныя. Мы гэта аўтарам звароту растлумачылі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### На амерыканскіх рынках рэкордны абвал



Са студзеня да сакавіка біржавы прамысловы індэкс Dow Jones, які аб'ядноўвае акцыі дзясяткаў найбуйнейшых кампаній ЗША, зваліўся на 23,2 працэнта, піша Market Watch. Гэта стала максімальным квартальным падзеннем з 1987 года. Washington Post лічыць цяперашні абвал максімальным за 135 гадоў з дня стварэння Dow Jones. Індэкс S & P500 апусціўся за гэты перыяд на 20 працэнтаў — найгоршы квартальны вынік з 2008-га, калі пачаўся сусветны фінансавы крызіс. Пры гэтым 24 сакавіка Dow Jones вырас адразу на 11,37 працэнта, што з'яўляецца максімальным аднадзённым паказчыкам з 1933 года. Гэта звязана з мерамі, якія ўлады ЗША прымаюць для выратавання эканомікі на фоне абвалу цэн на нафту і пандэміі каранавіруса. У прыватнасці, для гэтага плануюць выдзеліць каля чатырох трыльёнаў долараў.

### Для канкурсантаў адмененага «Еўрабачання» правядуць спецшоу

Арганізатары міжнароднага песеннага конкурсу «Еўрабачанне-2020», адмененага з-за пандэміі, 16 мая правядуць спецыяльнае шоу Eurovision: Europe Shine A Light з удзелам выканаўцаў-конкурсантаў гэтага года, а таксама канкурсантаў мінулых гадоў. Чакаецца, што ў ім возьмуць удзел прадстаўнікі 41 краіны, якія былі заяўлены на сёлетні конкурс. Арганізатары таксама маюць намер «аб'яднаць артыстаў 2020 года з краін па ўсёй Еўропе для выканання хіта мінулага «Еўрабачання «з аб'яднальным тэкстам, прыдатным для бягучай сітуацыі, у якой мы апынуліся». Чакаецца, што канцэрт будзе доўжыцца каля 2 гадзін. Шоў таксама будзе трансляваца на афіцыйным канале конкурсу ў YouTube.



### Дзікія козы апанавалі апусцелы Уэльс




Дзікія козы атакавалі горадок Ландзідна ў Паўночным Уэльсе. З-за каранціну, які абвешчаны ў краіне, яны бесперашкодна шпацыруюць па плошчах і парках, абскубваць кусты і вытоптваюць лужкі. Мясцовая паліцыя не паспявае сачыць за актыўным перамяшчэннем жывёл. Пра гэта паведамляе CNN. «Цяпер яны свабодна блукаюць па горадзе і становяцца ўсё смялейшыя без людзей», — апавядаюць мясцовыя жыхары. Ведама, што козы гэтага віду прыйшлі ў горад з марскога ўзбярэжжа, яны пасуцца там ужо доўгія гады. Радзімай жывёл навукоўцы лічаць паўночную Індыю і Кашмір.

Аты-баты

# СТАЛІЦА РЫХТУЕЦЦА ДА ПАРАДА

**Гэтымі днямі ў Мінску працягваецца падрыхтоўка да ваеннага парада ў гонар 75-й гадавіны Перамогі. Трэніроўкі праводзяцца тройчы на тыдзень. Пешая калона рэпеціруе праходжанне на плацы Мінскай ваеннай камендатуры. Механізаваная — на аэрадроме «Ліпкі». 5 і 7 мая пройдуць генеральныя трэніроўкі ў Мінску, а сам парад запланаваны на вячэрні час 9 мая.**



— Ён пройдзе ў традыцыйным фармаце з удзелам паветранага эшалона, механізаванай і пешай калон, — расказаў **намеснік міністра абароны Сяргей ПАТАПЕНКА.** — Парад скончыцца плац-канцэртам роты ганаровай варты і выступам зводнага аркестра. Усяго мяркуецца ўдзел да 3,5 тысячы вайскоўцаў, 185 адзінак тэхнікі і 42 паветраных суднаў, а таксама прадстаўнікоў Узброеных Сіл Расіі і Народна-вызваленчай арміі Кітая.

Як зазначыў Сяргей Патапенка, асаблівасцю сёлетняга парада стане тое, што ў ім будуць удзельнічаць толькі новыя і мадэрнізаваныя ўзоры тэхнікі. Амаль усе яна — на колах. Толькі адзін разлік механізаванай калоны будзе гусенічны. Канкрэтныя ўзоры тэхнікі намеснік міністра не назваў, зазначыўшы толькі, што сярод іх будзе рэактыўная сістэма залпавага агню «Флейта».

Пешую калону складуць 22 парадныя разлікі: 20 беларускіх і па адным — ад Расіі і Кітая. Прадстаўніцтва ў складзе механізаванай калоны будзе крыху іншае — 16 разлікаў беларускіх і два — расійскія. Па традыцыі калону ўзначаліць танк Т-34. Затым пройдуць 13 парадных разлікаў ад Узброеных Сіл Беларусі, лёгкабраніраваныя аўтамабілі «Ліс» унутраных войскаў МУС, парадны разлік ад Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, прадстаўлены 27 найноўшымі ўзорамі ўзбраення і ваеннай тэхнікі. Ад Узброеных Сіл Расіі мяркуецца ўдзел БТР-82А і параднага разліку аператыўна-тактычных ракетных комплексаў «Іскандэр». У складзе паветранага эшалона — 42 самалёты і верталёты, сярод якіх 34 беларускія і восем расійскіх.

Адзін з тых, хто пройдзе парадным крокам перад трыбунамі 9 Мая, — радавы Дзмітрый Урбанчык. Служыць ён у 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгадзе ў Брэсце. Дзмітрый трапіў у войска не так даўно — усяго чатыры месяцы таму.

— Да парада мы рыхтуемся ўжо трэці тыдзень. Першыя трэніроўкі пачаліся яшчэ ў Брэсце, каб прыехаць у Мінск ужо з пэўнымі навыкамі. Цяпер жа заняткі ў нас праходзяць двойчы на дзень: пасля сняданку і абеду, пяць разоў на тыдзень. Страявая мне далася лёгка — да службы ў войску займаўся футболам і водным пола. Таму і нага добра цягнецца.

Дзмітрый будзе ісці другі ў шарэнзе. Наколькі гэта складана?

— Так, перыядычна даводзіцца дапамагаць правафланговаму раўняць шарэнгу. Усё-такі яму не заўжды відаць, хто як ідзе. Ды і ў пары працаваць заўжды прасцей.




**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# СТАДЫЁН ДЛЯ ГУЛЬНІ НУМАР АДЗІН

## У сеціве з'явіўся прэзентацыйны ролік праекта Нацыянальнага футбольнага стадыёна ў Мінску

**Ідэя будаўніцтва чыста футбольнага стадыёна ў сталіцы была агучана ў 2010 годзе. Першапачаткова планавалася размясціць яго за межамі МКАД, у мікраёне Шчомысліца каля аднайменнай вёскі і перспектыўнага выставачнага комплексу. У 2013 годзе месцам будаўніцтва быў вызначаны стадыён «Трактар», аднак пасля ад рэканструкцыі «Трактара» было вырашана адмовіцца, а месцам новага стадыёна была вызначана пляцоўка непасрэдна каля яго. У 2017 годзе Аляксандр Лукашэнка папрасіў старшыню КНР Сі Цзіньпіна, каб «стадыён быў пабудаваны з кітайскім каларытам, каб усе, не толькі беларусы, бачылі, што гэта ўзор дружбы з кітайскім народам».**

Чаканая ўмяшчальнасць стадыёна — 33 тысячы гледачоў. Агульная плошча забудовы павінна скласці 48 тысяч квадратных метраў. У студзені 2019 года пачалася падрыхтоўка тэрыторыі для будаўніцтва стадыёна, ён праектуецца і будзе будавацца па кітайскіх стандартах, нормах і тэхнічных умовах. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што стадыён будзе падарункам Кітая.



У прэзентацыі паказана, што стадыён будзе размяшчацца ў цэнтры Мінска, чырвона-белы колер архітэктуры і зялёная тэрыторыя адлюстроўць нацыянальны стыль і прыродныя асаблівасці Беларусі. Адкрытасць пляцоўкі і архітэктурнага дызайну дазволяць паспяхова інтэграваць стадыён у гарадскі ландшафт. Праект стадыёна максімальна захоўвае і абараняе існуючыя зялёныя насаджэнні, уключае ў сябе пандусы, бегавыя дарожкі, пляцоўкі і іншыя элементы, утвараючы натуральны і гарманічны гарадскі спартыўны парк. На першым паверсе будуць размешчаны камерцыйныя памяшканні і футбольны музей.

Праектаванне стадыёна ажыццяўляецца цалкам у адпаведнасці са стандартамі УЕФА 2020 і ФІФА 2021, пасля завяршэння будаўніцтва ён стане футбольным стадыёнам сусветнага класа. Чакаецца, што там з'явяцца двухпавярховыя трыбуны — гэта паспрые высакаякаснаму прагляду матчаў. Поўная сістэма безбар'ернага асяроддзя забяспечыць комплекснае і зручнае абслугоўванне гледачоў з асаблівымі патрэбамі. Таксама стадыён будзе вельмі зручны для спартсменаў, прадугледжаны шматфункцыянальныя пакоі адпачынку.

Футбольнае поле абсталююць натуральным пакрыццём, вентыляцыйнай тэхнікай, ацяпленнем і асвятленнем для правядзення матчаў круглы год, таксама побач размесціцца рэзервовы газон. Навес з металічным пакрыццём здольны вытрымаць вялікую снегавую нагрузку, фасад мае двухслаёвую канструкцыю, якая вельмі эфектыўна спраўляецца са зменлівымі кліматычнымі ўмовамі, абараняючы ад ветру і сонца.

Нагадаем, што разам з футбольным стадыёнам кітайцы ўзвядуць беларусам басейн міжнароднага стандарту. Будаўніцтва арэны плануюць завяршыць да канца 2023 года.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Добрая навіна

# ВЯСНА НА КРЫЛАХ

**Буслы і першыя ластаўкі вярнуліся ў Беларусь. Пра гэта паведамляе сайт грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны».**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Падобна, што самая вясенняя краіна — Беларусь: менавіта ў нас на сённяшні дзень больш за ўсё назіранняў птушак-вестуноў «Жывой вясны». Усяго ў розных краінах адзначана 500 такіх назіранняў.

Першыя вясну на сваіх крылах нясуць нам белыя буслы. Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) ужо атрымала 281 паведамленне пра іх вяртанне ў Беларусь. Самага першага бусла заўважылі ў Брэсцкай вобласці яшчэ 18 лютага, а сёння гэтыя птушкі адзначаны ўжо ва ўсіх абласцях Беларусі.

А вось назіранняў вясновых ластавак пакуль яшчэ вельмі мала, так што калі вы іх бачылі, але не паспелі дадаць назіранне, то цяпер самы час!

На тэрыторыі Беларусі вызначаюць тры віды ластавак: гарадскую, вясковую і ластаўку-зямлянку. Птушкамі «Жывой вясны» лічацца два апошнія віды.

Акрамя вясковых ластавак, у першай палове красавіка павінны прыляцець зязюлі. Астатніх птушак — вестуноў вясны — чакаюць пазней: у пачатку мая вернуцца ластаўкі-зямлянкі і свіргулі, у канцы мая — шчуркі-пчалаедкі. Складанне вясновай карты — адна з асноўных актыўнасцяў «Жывой вясны». Чым больш назіранняў на карце — тым больш інтэнсіўным колерам зафарбаваная краіна. На карце можна бачыць дынаміку таго, як птушкі нясуць нам вясну.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Як дадаць назіранне?**

⇨ **на сайце «Жывой вясны» http://www.springalive.net/be-by/migrations/addnew пры дапамозе формы «Дадаць назіранне»;**

⇨ **запісаць сваё назіранне ў суполках кампаніі ў сацыяльных сетках Facebook і «ВКонтакте».**

# Дазатары з антысептыкам у метро

**У сталічным метрапалітэне пачалі ўстанаўліваць бескантактныя сэнсарныя дазатары з антысептычнымі сродкамі.**

Па інфармацыі падземкі, з'явілася ўжо больш за 20 такіх дазатараў з антысептыкамі. Імі плануюць абсталяваць усе станцыі і вестыбюлі. Пакуль жа асноўная іх маса размешчана ў вестыбюлях станцый з найбольшым пасажырапатокам.

У метрапалітэне выконваюць усе неабходныя прадпісанні, каб засцерагчы пасажыраў. Вагоны метро апрацоўваюць мыйнымі і дэзынфіцыруючымі сродкамі: праціраюць парэнчы, аконныя прaёмы, шкло, падлогу. Арганізавана поўная апрацоўка саставаў.

На станцыях мыйнымі і дэзынфіцыруючымі сродкамі рэгулярна праціраюць парэнчы, дзвярныя ручкі, месцы каля білетных кас — усё, да чаго датыкаецца пасажыр.

Пасажырапаток у метро сталіцы ў сакавіку скараціўся на 200 тысяч пасажыраў у параўнанні з лютым, аднак гэта не прывядзе да змяненняў у рабоце рухомага саставу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЧАСОВАЯ ПАЎЗА

«Белпошта» часова прыпыніла работу сэрвісу па пераналіраванні міжнародных рэгістраваных паштовых адпраўленняў для атрымання праз паштамат, паведамілі на прадпрыемстве. Арганізацыя выбачаецца за дастаўленыя нязручнасці.

Акрамя таго, у дастаўку міжнародных паштовых адпраўленняў працягвае ўносіць свае карэктывы пандэмія каранавіруса — з-за яе прыпынены шэраг авіярэйсаў. Цяпер не прымаюцца пісьмовая карэспандэнцыя і пасылкі ў Кітай. Пасылку немагчыма адправіць і ў Швецыю. Тэрміны дастаўкі адпраўленняў EMS, а таксама пісьмовай карэспандэнцыі і пасылак у іншыя краіны таксама могуць змяняцца.

Уся інфармацыя пра падобныя змены аператыўна змяшчаецца на сайце «Белпошты».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Тэндэнцыі

# МАСКІ НАРАСХОП

## Як пачувае сябе цяпер айчынны легпрам?

**Медыцынскія маскі ў Беларусі шыюць для ўнутранага рынку. Першачарговая задача — забяспечыць уласныя патрэбы. Пра гэта ў прэсцэнтры БелТА падчас чарговага пасяджэння праекта «Экспертнае асяроддзе» паведаміла начальнік упраўлення ўнутранага гандлю і выставачнай дзейнасці канцэрна «Беллегпрам» Святлана КАХРО.**

### АСАРТЫМЕНТ ПАД ПОПЫТ

Да прадпрыемстваў «Беллегпрама» падключаецца прыватны бізнес. «Звяртаюцца прадпрыемствы, у якіх сёння незагружаныя магутнасці, але ёсць швейнае абсталяванне, швачкі. Хутка перапрафілюем іх на выпуск масак», — сказала Святлана Кахро. Марлю для масак выпускае Баранавіцкае вытворчае бавоўнянае аб'яднанне («Блакіт»), бінты — магілёўскае прадпрыемства «Стужка». «Блакіт» павялічыў выпуск марлі ў 2,5 раза. Таксама тут наладзілі вытворчасць тканіны, якая дзякуючы спецыяльнай апрацоўцы можа яе замяніць.

На выпуск медыцынскіх масак пераарыентаваная частка прадпрыемстваў канцэрна. Вытворчасць паступова нарошчваецца і цяпер дасягае прыкладна 300 тысяч вырабаў у суткі. На мінулым тыдні гродзенскае ТАА «МедЛён» пачало выпускаць зменныя бавоўняна-льняныя ўкладышы, якія можна ляпіць на любую маску для ўзмацнення ахоўнага эфекту. Разам з тым у канцэрне «Беллегпрам» звяртаюць увагу, што казаць пра зацыкленасць на вытворчасці медыцынскіх вырабаў нельга, асартымент прадукцыі застаецца ранейшым.

Сітуацыя на сусветным рынку не магла не адбіцца на айчынным легпраме. У канцэрне характарызуюць яе як стрэсавую, але ў той жа час заклікаюць бачыць у ёй і некаторыя плюсы для эканомікі і спажыўцоў. Так, у цяперашніх умовах айчынныя прадпрыемствы пачнуць павялічваць сваю долю на ўнутраным рынку, што будзе спрыяць імпартазамяшчэнню.

Як паведамлялася, для забеспячэння фармацэўтычных арганізацый неабходным аб'ёмам медыцынскіх масак кіраўніцтва «Беллегпрама» прыняло рашэнне аб часовым перапрафіляванні шэрагу прадпрыемстваў для пашыву медыцынскіх вырабаў. Цяпер маскі будуць вырабляць 15 прадпрыемстваў, а агульны планаваны аб'ём вытворчасці — 550 тысяч вырабаў у суткі.

### НОВЫЯ НІШЫ

Спецыялісты пракаментавалі сітуацыю з пастаўкамі імпартнай сыравіны ў Беларусь. Яны працягваюць, хоць не без лагістычных збояў з-за пандэміі COVID-19, паведаміў начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Міхаіл Жыгала. МАРГ вядзе маніторынг таварапатокаў. Пры гэтым, як паведаміў генеральны дырэктар ААТ «Баранавіцкае вытворчае бавоўнянае аб'яднанне» («Блакіт») Іван Турчак, еўрапейскія краіны адгрузку сыравіны прыпынілі. Па іншых кірунках затрымкі ўзнікаюць у выніку каранцінных мерапрыемстваў на граніцы. Па прыездзе, напрыклад, у Турцыю дальнабойшчык на два тыдні адпраўляецца ў каранцін. «Калі раней сыравіна з Сярэдняй Азіі даходзіла на працягу 7-10 дзён, то сёння трэба не менш за месяц. Гэта дадатковы выклік у частцы забеспячэння базавай сыравінай», — канстатаваў кіраўнік ББВА.

Дэталёвы аналіз таварапатоку праз беларускую граніцу яшчэ не праводзіўся. Пакуль складана прывесці канкрэтныя лічбы, як на ім адбіліся меры, прынятыя краінамі-суседзямі з-за пандэміі каранавіруса. Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі мытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта Андрэй Шашкоў нагадаў, што рух фізічных асоб закрыты, для велікагрузаў такой забароны няма. Ён падкрэсліў, што беларуская мытня ў гэтых умовах робіць усё максімальна магчымае. У першачарговым парадку афармляюцца фуры з медыцынскімі таварамі.

Іван Турчак не выключыў, што ў цяперашніх умовах у беларускіх вытворцаў з'явіцца больш магчымасцяў, каб заняць новыя нішы. У той жа час ён звярнуў увагу, што сусветны рынак тавараў лёгкай прамысловасці ў сілу сваёй спецыфікі «будзе вельмі хутка падаць і вельмі павольна аднаўляцца». «І зразумела, што ў такой сітуацыі, напэўна, правілы гульні на рынку трэба было б у гэты перыяд перагледзець», — лічыць ён. Так, яшчэ да сітуацыі з COVID-19 на беларускім рынку стала з'яўляцца даволі шмат кантрафактнай прадукцыі, у тым ліку з краін Сярэдняй Азіі. Гэтыя тавары не адпавядаюць тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза і на тэрыторыю Беларусі трапляюць, як правіла, з Расіі. Што да сэканд-хэнду, то вытворцы адзення заяўляюць пра неабходнасць устанавіць аднолькавыя правілы і ў тым, што датычыцца захавання стандартаў бяспекі (так, з некаторых часоў дэзынфекцыя гэтых рэчаў перайшла ў разрад рэкамендацый), і ў частцы выплаты мытных плацяжоў. Некаторыя крамы сэканд-хэнду, карыстаючыся прававым прабелам, гандлююць стокавымі, па сутнасці, новымі рэчамі, канстатавалі спецыялісты.

### СТОК І СЭКАНД-ХЭНД

У Беларусі рыхтуюць змены для крам сэканд-хэнду: ім дазволяць гандляваць толькі паношаным адзеннем. Пра гэта паведаміў Міхаіл Жыгала: «Мы цяпер актыўна прапрацоўваем пытанні па карэкціроўцы гэтых правіл, па дакладным размежаванні і вызначэнні фармату работы такіх крам. Калі крама пазіцыянуе сябе як сэканд-хэнд, то будзьце добрыя тады прадавайце тавары, якія былі ва ўжыванні, а не стокавае адзенне. Калі гэта стандартны магазін, то адпаведна там можа рэалізоўвацца і сток». На яго думку, такая норма не будзе абмежавальнай.

Міхаіл Жыгала нагадаў аб прапанове канцэрна «Беллегпрам» вынесці крамы сэканд-хэнду з абласных цэнтраў, буйных гарадоў, з ажыўленых вуліц. У міністэрстве такія меры лічаць празмернымі ў цяперашніх рэаліях. «Таму што такія крамы — гэта ўсё-ткі крамы павышанага попыту. Але, на наш погляд, тут трэба менавіта рэгуляванне», — пазначыў ён пункт гледжання міністэрства.

Сэканд-хэнд адпавядае духу ўстойлівага спажывання, але і тут пажадана купляць свой тавар. Такое меркаванне выказаў Іван Турчак. Яго падтрымала старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Суша. Яна расказала, што каля 13 гадоў таму ўдзельнічала ў запуску праекта па ўстойлівым спажыванні. І замежныя эксперты выказваліся ў тым жа духу.

Генеральны дырэктар ТАА «Марк Фармэль» Андрэй Серыкаў падчас дыскусіі прывёў статыстычныя звесткі: за апошнія чатыры гады аб'ём увезенага ў краіну сэканд-хэнду павялічыўся ў пяць разоў. Толькі летась гэта лічба склала 48,5 тоны. Па яго словах, гэта больш чым удвая перавышае колькасць сыравіны, якую за той жа час перапрацавалі ўсе швейныя і тэкстыльныя прадпрыемствы Беларусі разам узятыя.

На слыху

# Пад медыцынскім назіраннем і на лячэнні 157 пацыентаў

## У Беларусі ўжо праведзена больш за 32 тысячы тэстаў на каранавірусную інфекцыю

**Як паведамляе Міністэрства аховы здароўя, у краіне працягваюцца мерапрыемствы па кантролі за эпідэміялагічнай абстаноўкай і ў выпадку неабходнасці адбываецца шпіталізацыя пацыентаў для далейшага абследавання і назірання.**

— За апошнія суткі выпісана пяць пацыентаў, у якіх раней тэст на COVID-19 даў станоўчы вынік. Пад медыцынскім назіраннем і на лячэнні знаходзіцца 157 чалавек, — паведаміла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія Барадун.

Больш за 50 чалавек у Беларусі папраівліся і выпісаны са стацыянара.

Учора быў зарэгістраваны другі выпадак смерці ўзроставага пацыента з наяўнасцю шматлікіх хранічных захворванняў, якія, па папярэдніх звестках, ускладнены каранавіруснай інфекцыяй. Гэта 70-гадовая настаўніца англійскай мовы з вёскі Доктаравічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Апошнія два тыдні яна правяла ў бальніцы з пнеўманіяй. А 30 сакавіка ў Віцебску была зафіксавана першая смерць ад ускладненняў каранавіруснай інфекцыі. Размова ідзе пра 75-гадовага акцёра Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, заслужанага артыста Беларусі Віктара Дашкевіча.

У свеце з пачатку пандэміі заразіліся 858 785 чалавек, паведамляе даследчы цэнтр сістэмных навук і інжынерыі Джонса Хопкінса (ЗША). Паводле апошніх звестак, больш за 42 тысячы чалавек памерла, папраівілася звыш 178 тысяч. Найбольшая колькасць захварэлых у ЗША — больш за 189 тысяч, памерла 3900 чалавек. У Кітаі заразілася больш за 82 тысячы. У Еўропе самай напружанай застаецца сітуацыя ў Італіі — зафіксавана 105 792 выпадкі, памерла больш за 12 тысяч хворых, папраівілася 15,7 тысячы. Сітуацыя ў Расіі таксама няпростая — больш за 2,3 тысячы інфіцыраваных, 17 чалавек памерла, 121 папраівіўся. У Польшчы заразілася больш за 2,3 тысячы чалавек, памерла 33, папраівіліся сем пацыентаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# У ПЕРШЫЯ Ж ГАДЗІНЫ

### Першы і другі ўзровень кантактаў



Усе людзі, пра кантакты з якімі ўспамінае чалавек, выхоўзячы з працягласці зносін з ім дзеляцца на так званыя кантакты першага або другога ўзроўню. Пры атрыманні гэтай інфармацыі цесныя кантакты адразу ж апавяшчаюцца па тэлефоне і ізалююцца ў асобныя медустановы, напрыклад шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны, пад назіранне. «Па звестках нашых кітайскіх, італьянскіх калег, сярод тых, хто ў выніку захворвае, 80-85 % прыпадае на блізкія кантакты, у прыватнасці сямейныя. У астатніх імавернасць захварэць значна ніжэйшая. Тым не менш усіх, хто кантактаваў з пацыентам на працягу 15-30 хвілін у зачыненым памяшканні, мы лічым блізкімі кантактамі і абавязкова ізалюем», — адзначыла намеснік галоўнага ўрача цэнтра.

Ірына Глінская растлумачыла, каго лічаць кантактам другога ўзроўню. Гэта можа быць, напрыклад, чалавек, які працаваў з захварэлым у адным будынку, але непасрэдна не кантактаваў з ім (не віталіся і не размаўлялі). У падобным выпадку рызыка заразіцца вельмі нізкая. Тым не менш за такім чалавекам на працягу 14 дзён усе роўна арганізуюць медназіранне. З ім на сувязь пастаянна выходзіць урач, апытвае, аглядае, вымярае тэмпературу. Больш за тое, чалавеку рэкамендавана на працягу двух тыдняў мінімізаваць свае кантакты, не ездзіць у грамадскім транспарце, а ў выпадку змены стану здароўя адразу ж звяртацца ў хуткую дапамогу. Яго таксама шпіталізуюць, правядуць дыферэнцыяльную дыягностыку і пры неабходнасці прызначаць лячэнне. «Калегі з Германіі, напрыклад, назіраюць толькі цесныя кантакты, гэта значыць тых, хто знаходзіўся ў адным памяшканні з заражаным 15 і больш хвілін. Іх не ізалююць у стацыянары, а прапаноўваюць самаізаляцыю. Гэта таксама варыянт. Але нашы мерапрыемствы ўсё ж такі шырэйшыя», — дадала спецыяліст.

### Ахоўныя меры

Паралельна са шпіталізацыяй у стацыянар пацыента, у якога пацверджаны COVID-19, іншая брыгада праводзіць дэзынфекцыйныя мерапрыемствы па месцы яго жыхарства, работы, часовага знаходжання, то-бок усюды, дзе гэты чалавек знаходзіўся. «Такіх месцаў па адным пацыенце можа быць дастаткова шмат, але ўсе яны ў найбліжэйшыя гадзіны апрацоўваюцца. Ліквідуецца ўзбуджальнік, які хай нават і непрацяглы час, але ўсё ж можа заставацца на розных паверхнях. Такім чынам мы выключаем нават невялікую, але магчымую рызыку кантактна-бытавой перадачы віруса», — дадала Ірына Глінская.

Безумоўна, медыкі прымаюць ахоўныя меры, каб засцерагчы і сябе, і навакольных людзей. Эпідбрыгады спецыяльна экіпіраваныя, а пацыента змяшчаюць у біябокс.

Пакольк спецыфічных вакцын ад COVID-19 на сёння няма, у спецыялістаў ёсць магчымасць падзейнічаць толькі на два гэтыя звёны: выяўленне крыніцы інфекцыі і кола кантактаў, а таксама разрыў механізма яе перадачы (дэзынфекцыя). «Аператыўнае і максімальна шырокае правядзенне такіх мерапрыемстваў дазваляе нам утрымліваць і кантраляваць сітуацыю», — падкрэсліла спецыяліст.

«Гэтая праца не заўсёды відаць шырокаму колу, але мы яе і не афішуем. Разам з тым ёсць індыкатары, якія сведчаць аб эфектыўнасці мер, якія праводзяцца», — адзначыла Ірына Глінская. Паводле яе слоў, такая работа дадае нагрузкі на сістэму аховы здароўя, але яна ў цяперашні час апраўданая. Сярод кантактаў першага ўзроўню знаходзяць тых, хто захварэў, а станоўчы вынік выяўляюць, як правіла, на 5-7-ы дзень шпіталізацыі: людзі заразіліся, але вірус пачалі выдзяляць, ужо знаходзячыся ў медустанове.

**БелТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сямейная газета
Выпуск № 7 (143)

# Выпрабаванне блізкасцю

*Як трапна заўважыла нядаўна калега, у гэтыя дні пра што ні пачынаеш пісаць, атрымліваецца пра каранавірус. (У «яго» нават дзеці ў двары майго дома гуляюць — бегаючы адно за адным, абзываюцца малазразумелым, а ад таго яшчэ больш крыўдным словам.) Вось і на сямейныя стасункі пандэмія паўплывала адмоўна. З аднаго боку, многія людзі, прытрымліваючыся рэкамендацый аб сацыяльным дыстанцыяванні, абмежавалі кантакты з пажылымі і састарэлымі родзічамі, а мы ў штодзённай мітусні, па шчырасці, і без таго бачыліся нячаста. З другога ж, тыя, хто асеў на добраахвотнай ці вымушанай самаізаляцыі, на працяглы час аказаліся ў шчыльным кантакце з уласнымі дзецьмі, якіх пастаянна — сюрпрыз! — трэба не толькі карміць, але займаць, забаўляць, выхоўваць і адукоўваць, а таксама з другімі палавінкамі.*

*Магчыма, вас гэта суцешыць: з падобнай праблемай сутыкнуліся прадстаўнікі абсалютна ўсіх слаёў насельніцтва. І калі, напрыклад, Джэніфер Лопес, Філіп Кіркораў ды шэраг іншых папулярных выканаўцаў, акцёраў і спартсменаў, якія сышлі на самаізаляцыю, публікуюць забаўныя відэа з хэштэгам #сядзідомадзетка пра тое, як яны свавольнічаюць, танцуюць, чытаюць кнігі, запісваюць новыя песні і забаўляюцца ўсёй сям'ёй, то прэм'ер-міністр Канады Джасцін Трудо, жонка якога захварэла на каранавірус, на працягу двух тыдняў вымушаны быў адначасова працаваць з дому і даглядаць траіх дзяцей ва ўзросце ад шасці да 12 гадоў, а таму спазнаў на сабе ўсё хараство сядзення з малымі: нядаўна ён нават спазніўся на анлайн-канферэнцыю з палітычнымі дзеячамі, таму што купаў малодшага сына.*

*Што ўжо гаварыць пра тых, у каго няма вялікага дома і ўчастка, а таму «сядзець у чатырох сценах» — не метафара, а рэальнасць. Невыпадкова прэзідэнт Ізраіля Рэўвен Рыўлін, якога ў краіне называюць «нацыянальным дзядулем», пачаў чытаць дзецям казкі анлайн, каб хоць крыху разгрузіць дыстанцыйна працуючых бацькоў. Бо нават калі мы вельмі любім збірацца разам і адчуваць сябе сям'ёй, знаходзіцца ўсім разам без аніякай асабістай прасторы ў рэжыме 24/7 — гэта не толькі радасць, але і дадатковыя клопаты і, калі хочаце, выклік. Выпрабаванне блізкасцю, мяркуючы па допісах у сацыяльных сетках, для шэрагу з нас стала цяжэйшае за ўсе іншыя. Гледзячы на прыклад Кітая, у якім пасля зняцця каранціну пракацілася хваля разводаў, псіхолагі прадракаюць такую самую імавернасць і ў нас (іншыя, зрэшты, наадварот, прагназуюць усплёск нараджальнасці гэтай зімой і вясной).*

*Адмова ад звыклых рэчаў, абмежаванні розных відаў актыўнасці, парушэнне балансу паміж часам, які кожнаму з нас, нават самым маленькім, патрэбна правесці ў адзіноце, каб аднавіць фізічныя і душэўныя сілы, і стасункамі з блізкімі — вялікі стрэс, кажуць спецыялісты. І гатовага рэцэпту, аднолькавага для ўсіх, як не даць гэтаму крызісу разбурыць сям'ю, няма і быць не можа. Але пэўныя рэкамендацыі псіхолагі ўсё ж даюць. Сярод іх — распарадак дня, выкананне звыклых і прыдуманне новых сямейных рытуалаў, чаргаванне спакойных і актыўных заняткаў, размовы анлайн, абавязковыя перыяды цішыні, якія варта правесці сам-насам хоць бы ў розных кутах, а лепш, натуральна, у розных пакоях... А перадусім — тое, з чым мы ў эпоху развітых камунікацый, як ні дзіўна, часта не спраўляемся, — трэба размаўляць адно з адным і пры гэтым чуць іншага, а не назапашваць крыўды і чакаць, што нехта пра іх здагадаецца. Адстойваючы свае межы, так лёгка незаўважна парушыць чужыя і раніц пачуцці блізкага... У рэшце рэшт, мы — галоўнае, што ў нас ёсць, і каб зберагчы гэтае «мы» ў сукупнасці розных «я» кожнай сям'і, на мой погляд, варта пазмагацца — хоць з вірусам, хоць са страхамі і няўпэўненасцю, хоць з самімі сабой.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

**Іван ЮРКІН:**

# «Для мяне сям'я на першым месцы»

## Упершыню яны пацалаваліся ў дзень вяселля і вось ужо 47 гадоў жывуць душа ў душу...

**Песні на вершы Івана ЮРКІНА карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Хто не ведае гімна гасціннасці нашай краіны — «Прыязджайце да нас у Беларусь»? А колькі лірычных песень створана на яго вершы — «Вёска мая», «Салаўіны гай», «Пасланне сыну»... Вось таму было цікава пазнаёміцца з музай паэта — яго жонкай Надзеяй Іванаўнай. Яны неверагодна арганічная і прыгожая пара!**

***— Памятаеце дзень знаёмства?***

**Надзея Іванаўна:** — Я вучылася ў 9 класе, а Ваня быў у нашай школе настаўнікам.

***— Вось гэта паварот!***

**Н. І.** — Усё не так, як вы падумалі! Я не была яго вучаніцай! Родам я са Смаленшчыны, у 9 і 10 класы даводзілася ездзіць 20 кіламетраў ад дому. А Ваня з Магілёўшчыны, жыў на хутары за восем кіламетраў ад маёй вёскі. Яго сястра працавала ў нашай школе, а мая мама была дырэктар. Вось сястра і папрасіла маму: маўляў, вазьміце на работу брата, ён не паступіў у ВНУ, дык, каб не губляў год, хай папрацуе ў школе. А мне неяк не вельмі былі цікавыя мясцовыя хлопцы — іх жа з пялюшак ведаеш.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*



Надзея Іванаўна і Іван Захаравіч.

Сітуацыя

# Аддам бабулю ў «добрыя рукі»!

## Адправіць састарэлага сваяка ў дом-інтэрнат супраць яго волі не атрымаецца

**Кожны з нас рана ці позна стане стары. На што мы разлічваем пры гэтым? Ці думаем, як будзем жыць, асабліва ў вельмі сталых гадах? Хутчэй за ўсё, мы адмахваемся ад падобных думак, таму што трэба быць цалкам бясстрашным чалавекам, каб сумленна расставіць кропкі над «і» ў гэтым пытанні. Але для тых, каму цяпер за 70-80, старасць — ужо рэчаіснасць. Якая яна? Давайце разгледзім адзін з варыянтаў...**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

selgazeta.ru

Вядома, у ідэале было б добра, каб старога чалавека, якому ўжо за 80, даглядалі яго дзеці, каб ён пражываў сваю старасць дома і сярод родных людзей. Але жыццё падкідвае велізарнае мноства сітуацый, калі гэта становішча амаль немагчыма. Дапусцім, сям'я праходзіць праз стадыю цяжкага разводу, з узаемнымі прэтэнзіямі, падзелам маёмасці і кватэры, і для пажылога чалавека тут цяпер не найлепшае месца... Або дзеці жывуць і працуюць за мяжой, і забраць туды бацькоў не ўяўляецца магчымым. Ці дарослая дачка, якая даглядала сваю старую маці, цяжка захварэла і сама мае патрэбу ў дапамозе... На жаль, бывае шмат абставін, калі адзіным выйсцем для пажылога чалавека становіцца дом састарэлых.

Пра тое, чаго чакаць ад гэтага варыянта, мы гутарым з **намеснікам начальніка ўпраўлення арганізацыі сацыяльнага абслугоўвання Міністэрства працы і сацабароны Мікалаем АРЛОМ.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# Аддам бабулю ў «добрыя рукі»!

На пазітыве

## КАЛІ МОЖНА «ІНАКШ»

### Людзі з аўтызмам паспяхова адаптуюцца ў грамадстве

**У Мінску прайшоў традыцыйны паўмарафон «Інакш», прысвечаны Сусветнаму дню інфармавання аб праблеме аўтызму і арганізаваны некамерцыйнай арганізацыяй «Каманда «Крылы анёлаў».**

Зарэгістравалася на прабег каля 300 чалавек, але ў сувязі з трывожнай эпідэміялагічнай сітуацыяй у мерапрыемстве можна было ўдзельнічаць і аддалена.

— Мы высылалі ўдзельнікам стартавы нумар, — тлумачыць **дырэктар установы «Каманда «Крылы анёлаў» Дзмітрый ЦІМАШКОЎ.** — Людзі беглі паўмарафон і здымалі відэа ці рабілі фота ды дасылалі нам. Па выніках прабегу мы дасылалі ім медалі. Такім чынам ахвотныя ўдзельнічалі ў мерапрыемстве і выконвалі меры засцярогі, рэкамендаваныя Міністэрствам аховы здароўя.

Але, нягледзячы на магчымасць удзельнічаць ў мерапрыемстве аддалена, каля ста чалавек прыйшлі на рэальны прабег. Каб людзі менш рызыкавалі, арганізатары ажыццявілі збор на вуліцы, адмянілі дзіцячы старт і абмежавалі ўзрост удзельнікаў.

— У людзей ёсць неабходнасць у фізічнай актыўнасці, таму ўдзельнікі мерапрыемства прыйшлі пазітыўна настроеныя, — сказаў Дзмітрый Цімашкоў. — І нягледзячы на тое, што ўся ўвага сёння сканцэнтравана на барацьбе з каранавірусам, іншыя праблемы таксама трэба вырашаць. Мы сабраліся дзеля таго, каб грамадства звярнула ўвагу і на праблемы людзей з аўтызмам.

Увогуле інклюзіўны паўмарафон «Інакш» праходзіць ужо чацвёрты год, у ім удзельнічаюць і здаровыя людзі, і людзі з інваліднасцю, у тым ліку з аўтызмам.

Паводле інфармацыі СААЗ, суадносіны колькасці дзяцей з аўтызмам і здаровых у свеце — 1 да 160, а амерыканская медыцына лічыць, што 1 да 59. Праблема сацыяльнай адаптацыі такіх людзей даўно выйшла за рамкі сям'і ці нават асобнай дзяржавы. Таму дзеці з аўтызмам аказаліся ў ліку першых удзельнікаў каманды «Крылы анёлаў».Назіраючы за паўмарафонам на працягу апошніх гадоў, арганізатары заўважылі: сумесны спорт — фізічная актыўнасць, дасягненне мэты і радасць руху — паспяхова збліжае звычайных і асаблівых людзей. Арганізатары таксама адзначылі пазітыўныя перамены і ў стаўленні беларускага грамадства да людзей з аўтызмам.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— У гэтым пытанні нам трэба памятаць аб прынцыпе добраахвотнасці, — адразу ж папярэджвае наш суразмоўнік. — Жаданне дзяцей тут не мае ніякага значэння. Трапіць у дом-інтэрнат пажылы чалавек можа пры адзінай умове: ён сам павінен гэтага хацець. «Здаць» дзядулю або бабулю ў дом-інтэрнат супраць іх волі нельга. Вядома, калі чалавек можа сам сябе абслугоўваць, наўрад ці ён захоча пайсці туды жыць. Але з цягам часу, калі ён ужо перастае спраўляцца з жыццёвымі задачамі, у шэрагу выпадкаў дом-інтэрнат можа стаць адзіным выйсцем, асабліва калі ў чалавека ёсць медыцынскія паказанні.



Фота носіць ілюстрацыйны характар. vitvesti.by

## Як трапіць у дом-інтэрнат для састарэлых?

— Для гэтага чалавек павінен або звярнуцца з заявай ад свайго імя ў мясцовы орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, або зрабіць гэта праз тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання (ТЦСАН), — тлумачыць спецыяліст. — Але лепш усё ж звярнуцца самому ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне: там адразу ж і пракансультуюць, і раскажуць аб неабходных дакументах, і самі паралельна пачнуць іх збіраць.

## Якія дакументы патрэбныя?

Перш за ўсё пашпарт. Яшчэ заключэнне УКК пра неабходны тып дома-інтэрната, выпіска з медыцынскіх дакументаў (для пачатку трэба звярнуцца ў паліклініку да свайго ўчастковага тэрапеўта). Таксама патрэбны дакументы, якія пацвярджаюць права на льготы. Тут маецца на ўвазе перш за ўсё пасведчанне інваліда, калі яно ёсць. Ці, напрыклад, пасведчанне ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны і г. д. Яны даюць права на першачарговае ці нават пазачарговае пасяленне ў дом-інтэрнат. Праўда, на 1 студзеня гэтага года чэргаў на пасяленне туды ў нашай у краіне не было.

**Зараз у дамах-інтэрнатах агульнага тыпу жыве каля трох тысяч пажылых беларусаў, што складае прыблізна 1 % ад агульнай колькасці пажылых людзей у краіне. У Заходняй Еўропе ў падобных установах пражывае прыкладна 5-6 % пажылых людзей.**

Таксама органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне самі запытваюць звесткі аб месцы жыхарства і складзе сям'і; даведку аб жылых памяшканнях, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадзяніна ў адпаведным населеным пункце; запытваюць (афармляюць) даведку аб памеры пенсіі, копію заключэння МРЭК аб інваліднасці, акт абследавання матэрыяльна-бытавых умоў пражывання.

— Навошта неабходны ўсе гэтыя даведкі? — пытаем Мікалая Анатолевіча.

— Таму што чалавек выпісваецца са сваёй кватэры і прапісваецца ў доме-інтэрнаце. Дзяржава не забірае яго кватэру. Гэта можа адбыцца толькі пры волевыяўленні самога чалавека, калі паміж чалавекам і дзяржавай заключаецца дагавор рэнты.

Што да складу сям'і, то ён уплывае на аплату. Калі ёсць працаздольныя дзеці, то-бок ва ўзросце ад 18 гадоў і да пенсійнага ўзросту, і калі яны не з'яўляюцца інвалідамі 1-й або 2-й групы, то чалавек пасяляецца ў доме-інтэрнаце на платнай аснове.

## Колькі каштуе дом-інтэрнат?

Кошт утрымання чалавека складае 961 рубель у доме-інтэрнаце агульнага тыпу і 776 рублёў у доме-інтэрнаце псіханеўралагічнага тыпу. Столькі дзяржава траціць у месяц на аднаго чалавека.

Але аплата пражывання ў доме-інтэрнаце, устаноўленая дзяржавай, іншая. Пражыванне за адзін месяц абыдзецца ў суму каля 500 рублёў. Аплата можа ў розных рэгіёнах адрозніваецца, але нязначна.

Адзінокія людзі (а таксама тыя, у каго дзеці ўжо пенсіянеры або з'яўляюцца інвалідамі 1-й ці 2-й групы) пражываюць бясплатна. Але пры гэтым яны атрымліваюць на рукі не ўсю пенсію, а толькі 10 % ад яе.

## Дом-інтэрнат — гэта ўжо назаўсёды?

Зусім не абавязкова. Калі, напрыклад, стан чалавека палепшыўся (у жыцці ўсякае бывае), або яму не спадабалася тут, або ён проста перадумаў, можна напісаць заяву на імя дырэктара і вярнуцца дадому. Ніхто яго гвалтоўна ўтрымліваць не будзе.

І ў цэлым: можна не перабірацца ў дом-інтэрнат адразу на пастаяннай аснове. Спецыялісты рэкамендуюць спачатку пасяліцца туды часова (часовае станоўішча можа расцягнуцца як на 1-2 месяцы, так і на 6—8 і нават на год). Пры гэтым можна пакуль не выпісвацца са сваёй кватэры. Іншымі словамі, пажылы чалавек можа «прымераць» на сябе такое жыццё, паглядзець, ці будзе яно яго задавальняць.

## Ці можна самому выбраць дом-інтэрнат?

Можна, але толькі ў межах той вобласці, дзе чалавек прапісаны. Дзеці могуць з'ездзіць у некалькі такіх установ, паглядзець і выбраць, у якую хацелася б пасяліць свайго пажылога сваяка.

## Чаго чакаць ад дома састарэлых?

Вось што гаворыцца пра гэта на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны: усім грамадзянам, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах, даецца жылое памяшканне з разліку не менш чым 6 кв. м на чалавека, чатырохразовае харчаванне, мяккі інвентар згодна з устаноўленымі нормамі. Грамадзянам, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, — адзенне і абутак, неабходнае бытавое абслугоўванне (прыборка пакоя, мыццё і прасаванне адзення, змена нацельнай і пасцельнай бялізны, паслугі цырульніка).

У дамах-інтэрнатах аказваюцца сацыяльныя паслугі ў адпаведнасці з Пералікам бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг дзяржустаноў сацыяльнага абслугоўвання з нормамі і нарматывамі забяспечанасці грамадзян гэтымі паслугамі, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2012 г. № 1218 «Аб некаторых пытаннях аказання сацыяльных паслуг».

**На сёння ў Беларусі функцыянуе 81 стацыянарная ўстанова сацыяльнага абслугоўвання. З іх псіханеўралагічных дамоў-інтэрнатаў для састарэлых і інвалідаў — 51, дамоў-інтэрнатаў агульнага тыпу для састарэлых і інвалідаў — 20, дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця — 9, а таксама Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы.**

Акрамя таго, у дамах-інтэрнатах арганізаваны кругласутачны догляд, аказваецца неабходная медыцынская дапамога як дактарамі, так і медыцынскімі сёстрамі, праводзяцца фізіятэрапеўтычныя працэдуры і заняткі па лячэбнай фізкультуры, працуюць стаматалагічныя кабінеты. Нямала ўвагі ўдзяляецца арганізацыі вольнага часу. Працуюць клубы, гурткі па інтарэсах, можна рэалізаваць сябе ў творчасці.

Для забеспячэння пажылым людзям і інвалідам такой неабходнай для іх незалежнасці і максімальнай самастойнасці ва ўстановах ствараецца безбар'ернае асяроддзе. Жылыя пакоі, памяшканні грамадскага карыстання абсталёўваюцца поручнямі, пандусамі, тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі.

— У сярэднім у нашых дамах-інтэрнатах для пажылых людзей агульнага тыпу 2-3-месные размяшчэнне, — дадае Мікалай Арол. — У пакоі — ложкі, тумбачкі, шафа... Тэлевізар, як правіла, у холе. Дарэчы, многія дамы-інтэрнаты — гэта былыя санаторыі. Таму там блочная планіроўка, у блоках ёсць усе выгоды.

## Што можна ўзяць з сабой?

— Ці можна, напрыклад, прывезці з сабой любімы фікус? — спыталі мы спецыяліста.

— Гэта не забараняецца, можна браць нейкія любімыя рэчы, у тым ліку і прадметы інтэр'еру. Адзінае, на што накладзена забарона, — гэта хатнія жывёлы. Узяць улюбёнца з сабой, на жаль, не атрымаецца.

**Святлана БУСЬКО.**

### За і супраць

**Вось некалькі меркаванняў наконт дамоў-інтэрнатаў для пажылых. Тэма аказалася настолькі далікатная, што нашы суразмоўцы папрасілі не называць прозвішчаў.**

**Аляўціна Іванаўна, 56 гадоў:**

— Дом састарэлых — гэта крайняя мера, не ведаю, кім трэба быць, каб «здаць» туды роднага чалавека. Я ўпэўнена, што так робяць толькі эгаісты, якія жывуць па прынцыпе: абы сабе, любімага, не патурбаваць. Людзі з узростам прыкіпаюць да родных сцен. І мяняць звычкі ў 80-90 гадоў — вельмі цяжка, амаль немагчыма. Пераезд у дом-інтэрнат — такі моцны стрэс для старых, што з-за яго многія там у хуткім часе і паміраюць...

**Ірына Сяргееўна, 42 гады:**

— Уявіце сабе: дзядуля не можа сам адзецца або пераварнуцца ў ложку без вашай дапамогі, яму патрэбны кругласутачны догляд... Не ўсе сем'і могуць дазволіць сабе наняць сядзелку. Ды і яна прыходзіць у дом, як правіла, на нейкі час, а не дзяжурыць кругласутачна. І што рабіць, напрыклад, дачцэ такога старога? Звальняцца з работы? Забыцца пра сваё жыццё і ледзь не кругласутачна дзяжурыць каля яго? А ў яе яшчэ двое дзяцей і муж, увогуле сям'я... І вось як самому старому не адчуваць сябе цяжарам для ўсёй сям'і пры гэтым?

Я, дарэчы, да гэтага часу так і не змагла адказаць для сябе на пытанне, што ж рабіць з вельмі пажылым сваяком, калі яму ўжо зусім дрэнна і патрэбна кругласутачная дапамога. Бо не рэдкасць, калі паралізаваныя людзі і па 10-15 гадоў пасля інсульту жывуць... З аднаго боку, класці сваё жыццё на алтар іх догляду — не варыянт. Ведаю выпадкі, калі пасля многіх гадоў такой сітуацыі людзі перагаралі, і жыццё для іх станавілася проста невыносным. Але і як «збыць» з рук роднага чалавека — таксама пытанне...

**Уладзімір, 38 гадоў:**

— Некаторыя старыя быццам і жывуць дома, але па сутнасці закінутыя: з імі амаль не размаўляюць, да іх ставяцца грэбліва. Бываюць і крайнія варыянты, калі яны зазнаюць гвалт: іх б'юць, на іх крычаць, забіраюць пенсію — ёсць жа і такія сітуацыі. У гэтым выпадку, я думаю, дом састарэлых — лепшы варыянт.

## Вера КАРЭЛАВА:

# «РАНА НАС УСПРЫМАЦЬ ЯК ЛЮДЗЕЙ МІНУЛАГА ЧАСУ»

**Памятаеце крылатую фразу: «Ці лёгка быць маладым»? А мы вырашылі даведацца: ці лёгка быць пенсіянерам? Асабліва калі ўсё яшчэ хочаш працаваць, жыць як мага больш актыўна. Пагаварыць пра гэта пагадзілася мінчанка Вера КАРЭЛАВА, якая доўгі час працавала ў сферы сацыяльнай дапамогі насельніцтву.**

***— Як прайшоў ваш першы дзень пасля выхаду на пенсію?***

— Яшчэ да афармлення пенсіі разумела, што буду шукаць новую работу. Не ўяўляю сябе жанчынай, якая сядзіць дома. Людзям майго пакалення хочацца хоць цяпер атрымаць тое, што ў маладосці не было даступна. Для некага гэта падарожжы, для іншых — палепшаная якасць жыцця. А ў першы дзень я склала рэзюмэ і размясціла яго на сайтах. Гэта быў 2014 год, тады адкрывалася шмат гасцініц. Мне гэта здалося цікавай сферай дзейнасці. Прайшлася па некаторых з іх, вельмі спадабалася ў «Гарні», дзе была вакансія загадчыцы нумарным фондам. Многаму давялося вучыцца, але мне гэта было цікава, я не саромелася звяртацца з пытаннямі да калег. Тут я адпрацавала шэсць гадоў, а цяпер у мяне ёсць новая прапанова.

***— Вас не засмучае змена дзейнасці і калектыву?***

— Наадварот, мне здаецца, што гэта вельмі добра, бо ў жыцці з'яўляецца нешта новае. Вельмі ўдзячная былому і цяперашняму кіраўніцтву «Мінатэля» за тое, што ў свой час пачалі прымаць на работу людзей перадпенсійнага і пенсійнага ўзросту. Дырэкцыя паверыла ў гэтых людзей, дала нам шанц, хоць многія гасцініцы, няхай гэта і не афішуецца, шукалі тых жа пакаёвак ва ўзросце да 40 гадоў.

> **«Зносіны — вельмі важны складнік, пакуль мы сярод людзей, пакуль мы цікавыя і патрэбныя адно аднаму, мы жывём!»**

***— Работнікаў пенсійнага ўзросту час ад часу абвінавачваюць у тым, што яны «трымаюцца за пасаду». У той жа час не сакрэт, што не толькі на пенсіі, але ўжо і пасля 45 гадоў работніку прапануюць пасады, заведама ніжэйшыя за яго патэнцыял...***

— Як бы чалавек ні трымаўся за пасаду, у яго ёсць наймальнік. І калі падаўжаюць кантракт з 70-гадовым кіраўніком, значыць, не бачаць альтэрнатывы. Прычын тут можа быць шмат, апошняя з якіх — свядома не фарміруюць рэзерв на кіруючую пасаду. А тое, што спецыяліст старэйшы за 45 гадоў, часам не можа атрымаць работу, якая адпавядае яго кваліфікацыі, проста прыніжае чалавека. У нас павышаецца пенсійны ўзрост, але свядомасць наймальнікаў адстае. Цяперашнія 50-гадовыя па пашпарце значна маладзейшыя псіхалагічна і фізічна, чым іх бацькі ў гэтым узросце, а нашы дзеці будуць яшчэ маладзейшыя! Таму рана нас успрымаць як людзей мінулага часу. Менавіта работнікі ва ўзросце 50+ могуць быць залатым фондам працоўнага калектыву: ёсць вопыт, адукацыя, выраслі дзеці, вырашаны бытавыя пытанні, і ўсё яшчэ цікава жыць.



Вера КАРЭЛАВА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— З-за чаго, на ваш погляд, у працоўных калектывах бываюць канфлікты «бацькоў і дзяцей»?***

— Вылучыла б дзве асноўныя памылкі старэйшага пакалення. Першая: некаторыя ўзрост разглядаюць як нейкую заслугу — мне ўсе павінны, таму што мне шмат гадоў. Але ўзрост — гэта не заслуга, а хутчэй удача. Другая: калі маеш намер працаваць, трэба адпавядаць — сёння толькі на вопыце не ўтрымаешся, неабходна ўмець успрымаць навацыі. Працуючаму пенсіянеру трэба разумець свае магчымасці. Нехта спакойна вытрымлівае работу з поўнай нагрузкай, камусьці трэба нешта лягчэйшае, досыць і паўстаўкі.

А малодшае пакаленне часта не хоча нічога ведаць пра чалавека, акрамя ўзросту. І менавіта па гэтым крытэрыі «бракуе» калег.

***— Радуе, што мы бачым усё больш элегантных, дагледжаных людзей пенсійнага ўзросту. А вы што робіце, каб добра выглядаць?***

— Мне здаецца, нічога асаблівага не раблю. Карыстаюся беларускай касметыкай, якая, дарэчы, добра каціруецца за мяжой. Імкнуся больш хадзіць пешшу, наведваю басейн. Калі параўнаць з маёй маладосцю — тады сядзелі па тры гадзіны ў чарзе да цырульніка, — цяпер няма такіх праблем. Можна выбраць майстроў па сваіх фінансавых магчымасцях. Я не з тых жанчын, у якіх вялікі гардэроб і кожны раз праблема: што надзець. Лічу, што рэчаў павінна быць няшмат, але каб яны добра спалучаліся паміж сабой. Яшчэ гадоў пяць таму сказала б, што сапраўдныя зніжкі бываюць за мяжой, а ў нас так сабе. Але сітуацыя змянілася: зніжкі 50—70 % на беларускую вопратку — гэта рэальнасць. Тым больш што на зніжках часцей за ўсё бываюць класічныя фасоны, а не ўльтрамодныя. Ды і крамы замежных брэндаў ладзяць распродажы, там можна адзецца без вялікай страты для кашалька.

***— Як вы лічыце, гэта нармальна, калі бацькі-пенсіянеры фінансава дапамагаюць дарослым дзецям?***

— У мяне няма адназначнага адказу, усё залежыць ад традыцый, сітуацыі ў сям'і. Не заўсёды дзеці, якім дапамагаюць, лайдакі. Але глядзіце, цяпер усё часцей нараджаюць не толькі другое-трэцяе, але часам і першае дзіця ў 38—40 гадоў. Тое дзіця ў 20 гадоў яшчэ вучыцца, а бацькам 58—60 гадоў. У мяне двое сыноў, абодва працуюць, цалкам самадастатковыя. Маё пакаленне расло ва ўмовах, калі бацькі дзяліліся з дзецьмі апошнім, таму і мне хочацца часам сваім дапамагчы.

***— А ўнукаў, напэўна, песціце?***

— Гэта таксама няпростае пытанне. Адказнасць за выхаванне дзяцей павінны несці бацькі, а не бабуля. Тое, што было добра, калі раслі мае сыны, цяпер часам не працуе, таму я пагадзілася з падыходамі да выхавання сына і нявесткі. Песціць унукаў можна парознаму — абняць, схадзіць у цырк, напячы піражкоў. Вядома, і падарункі хочацца зрабіць, але ў нас правіла — абмяркоўваю патэнцыйныя прэзенты з бацькамі.

***— Кажуць, у пенсіянераў тры цікавасці: унукі, паліклініка, лецішча.***

— З узростам, думаю, у кожнага з'яўляюцца тыя ці іншыя пытанні са здароўем. Я не выключэнне, проста навучылася жыць са сваёй праблемай. Лецішча ў мяне няма, але ёсць бацькоўскі дом на Брэстчыне. Гэта памяць пра бацькоў, таму праводжу там адпачынак, падтрымліваю ў доме жыццё. Імкнуся, каб і дзеці з унукамі не забывалі пра спадчыну, пра нашы карані.

***— Як праводзіце вольны час?***

— Наведваю тэатры, канцэрты, люблю чытаць, як я кажу, жывыя, а не электронныя кнігі. Па магчымасці адпраўляюся ў невялікія падарожжы. Насуперак стэрэатыпам, усё можна арганізаваць за цалкам даступныя для працуючага пенсіянера грошы. Вядома, даўно асвоіла камп'ютар, усе сучасныя сродкі сувязі — гэта дапамагае падтрымліваць кантакты з роднымі, сябрамі, якія жывуць не толькі ў розных гарадах, але і краінах. Зносіны — вельмі важны складнік, пакуль мы сярод людзей, пакуль мы цікавыя і патрэбныя адно аднаму, мы жывём!

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Вы прасілі расказаць

# ЗБЕРАГЧЫ ГРОШЫ І НЕРВЫ



**Правы на дзяцей, маёмасць, жывёл, бізнес і інтэлектуальныя здабыткі муж і жонка, а таксама жаніх і нявеста могуць прапісаць у шлюбным дагаворы.**

У дакуменце можна падзяліць абавязкі па доме, зарплату, рэчы, якія набылі сужэнцы, і нават тыя, якія яны яшчэ толькі збіраюцца набыць.

Шлюбны дагавор можна заключыць да шлюбу, падчас яго і ў тым ліку непасрэдна перад разводам. Ва ўсіх варыянтах добраахвотная дамоўленасць бакоў спрыяе бяспецы іх капіталаў, зберагае нервы, грошы і час пры скасаванні шлюбу і здымае пытанні па атрыманні спадчыны.

— Шлюбны дагавор — спосаб добраахвотна, без прыцягнення суда і сведак, вырашыць маёмасныя і немаёмасныя пытанні, а таксама дэталёва вызначыць моманты, якія датычацца ўтрымання непаўналетніх дзяцей і сямейных абавязкаў, — сцвярджае **Вольга ФЯДУЦІК, кансультант упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі.** — Да таго ж вырашэнне маёмасных пытанняў пры заключаным шлюбным дагаворы значна таннейшае, чым праз суд.

У нейкіх выпадках шлюбны дакумент — гэта «план» на перспектыву.

— Напрыклад, у нявесты ёсць зямельны надзел, дзе з часам мяркуюць збудаваць дом. Каб вызначыць, чыя гэта будзе маёмасць, лепш скласці дагавор, інакш дом будзе сумесна нажытай маёмасцю, — тлумачыць прадстаўніца Мінюсту.

Калі дагавор складаюць да таго, як ствараць сям'ю, то ён пачынае дзейнічаць толькі пасля рэгістрацыі шлюбу. Калі ж дакумент робяць ужо муж і жонка, яны могуць абазначыць тэрмін, калі дагавор павінен уступіць у сілу: з моманту натарыяльнага засведчання або ў нейкі абазначаны мужам і жонкай час, у тым ліку і перад скасаваннем шлюбу, расказала **Галіна КАВАЛЬЧУК, натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі:**

— У шлюбны дагавор з цягам часу можна дадаць змены ў выглядзе дадатковых пагадненняў, а таксама скасаваць дакумент. Пасля разводу дзеянне дагавора спыняецца, і дадаць у яго ўжо нічога немагчыма. Праўда, ёсць выключэнні — калі сужэнцы ўстанаўліваюць адносіны да нейкіх абавязкаў, як правіла, па ўтрыманні адно аднаго пасля разводу ці матэрыяльным забеспячэнні дзяцей.

Бывае, муж і жонка прапісваюць умовы выплаты крэдыту, выдадзенага на куплю кватэры. Вызначаюць, хто будзе плаціць грошы, калі маёмасць пяройдзе ва ўласнасць аднаго з сужэнцаў пасля разводу.

**Шлюбны дагавор перш за ўсё і рэгулюе правы на ўласнасць, якая была прыдбаная падчас сямейнага жыцця.** І ў мужа, і ў жонкі роўныя правы на ўсю сумесна набытую ўласнасць, у тым ліку і на інтэлектуальную, згодна з артыкулам 23 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, падкрэсліла натарыус.

— Калі адзін падчас шлюбу быў заняты вядзеннем хатняй гаспадаркі і доглядам дзяцей і не меў уласнага заробку, а другі ў гэты час пісаў вершы і карціны, то апошняе лічыцца агульным і дзеліцца папалам. Аднак у шлюбным дагаворы можна абазначыць, што творы мастацтва будуць належаць толькі іх аўтару. З іншага боку, Кодэксам аб шлюбе і сям'і забараняюцца здзелкі паміж сужэнцамі адносна маёмасці, набытай у шлюбе, — яе нельга ні падарыць, ні прадаць адно аднаму. Калі муж і жонка хочуць, напрыклад, пераафарміць кватэру, набытую ў шлюбе, з аднаго на другога, то амаль што адзіны магчымы варыянт — шлюбны дагавор, у якім абазначаецца пераход права ўласнасці. Важна памятаць, што калі прадмет шлюбнага дагавора — нерухомая маёмасць, то дакумент уступіць у сілу толькі з моманту яго рэгістрацыі ў агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры.

Шмат розных умоў муж і жонка прапісваюць у шлюбным дагаворы адносна дзяцей. Гэта вызначэнне месца пражывання малога, выезды за мяжу, іх утрыманне (без уліку аліментаў), месца знаходжання падчас канікул, наведванне секцый і гурткоў.

> — Паступова беларусы пазбаўляюцца ад стэрэатыпу, што шлюбны дагавор — гэта недавер да партнёра. Колькасць дагавораў з году ў год павялічваецца, і ўсё больш людзей разумеюць перавагі гэтага дакумента, калі справа даходзіць да вырашэння маёмасных пытанняў ці аліментаў. Летась у Беларусі было заключана 4112 дагавораў, а за тры месяцы 2020-га — ужо 1075, — паведаміў **Артур СТРЭХ, памочнік старшыні Беларускай натарыяльнай палаты.**

— У адным з дагавораў бацькі, што набывалі для непаўналетняга дзіцяці кватэру, вызначаліся да дробязяў, які там павінен быць рамонт і нават мэбля, — расказала натарыус. — А аднойчы бацькі хацелі прапісаць веравызнанне малога. Такое зрабіць мы, вядома, не маглі, бо гэта закранае інтарэсы трэціх асоб. У дадзеным выпадку — дзіцяці, якое само павінна вызначыцца пасля паўналецця.

Існуюць і іншыя моманты, якія нельга адлюстраваць у шлюбным дагаворы. Напрыклад, нельга адмовіцца ад выплаты аліментаў, нават калі другая палова атрымала вялікую спадчыну.

— У шлюбным дагаворы можна таксама акрэсліць умовы выплат агульных даўгоў мужа і жонкі і права патрабавання па абавязках, якія ўзніклі ў інтарэсах сям'і. Уключыць у дакумент можна і долю ў фондах прадпрыемства, акцыі і іншыя актывы, калі гаворка ідзе пра людзей, якія працуюць у сферы бізнесу. Аднак гэта датычыцца толькі арганізацый, зарэгістраваных на тэрыторыі Беларусі, — падкрэсліла Галіна Кавальчук. — Тое ж самае і з замежнай маёмасцю — праваўладанне ёю нельга вызначыць беларускім заканадаўствам, трэба звяртацца да закона краіны яе прыналежнасці.

**Ірына СІДАРОК.**

Мужчыны пра жанчын

Сяргей МАКОЎСКІ:

# «Глядзіце ў адным кірунку, а не адно на аднаго»

**Сёння ў рубрыцы «Мужчыны пра жанчын» — Сяргей Макоўскі, стваральнік і кіраўнік грамадскага аб'яднання «Анкалогія і Здароўе». Сёлета аб'яднанню споўнілася 17 гадоў. Таксама Сяргей прадстаўляе Расійска-Чэшскую гандлёвую палату ў Беларусі, а ў якасці другога хобі называе венчурную сферу. Цяпер ён рыхтуе маштабны міжнародны праект, у рамках якога будзе зняты мастацкі фільм на тэму барацьбы з ракам. Пакуль у стварэнні кінафільма плануецца ўдзел трох краін: Беларусі, Расіі і Кітая, але, магчыма, да іх далучацца Францыя і ЗША. Фінансаваць фільм будуць інвестары з розных краін. Сяргей спадзяецца, што яго праект дапаможа нашаму грамадству стаць больш спагадлівым і добрым.**



***— Самае чароўнае ў жанчынах — гэта...***

— Іх непасрэднасць і жаноцкасць. Гэтыя якасці заўсёды вельмі прывабныя. Асабліва жаноцкасць, бо сёння яе чамусьці ўсё менш. У некаторых жанчын яна, магчыма, ўтоена, а некаторыя не разумеюць, што гэта.

***— Што для вас жаноцкасць?***

— Гэта чароўная аўра, якая лунае вакол жанчын і дае нам магчымасць адчуць сябе мужчынамі. Гэта манера сябе падаць, спакой і лаканічнасць у зносінах, ураўнаважанасць у голасе. Жаноцкасць складаецца з многіх элементаў, зразумець якія здольна, напэўна, толькі сама жанчына. Яна можа стаць для мужчыны музай, выклікаць жаданне тварыць і праяўляць знакі ўвагі. Думаю, гэта «зашыта» ў самой прыродзе. Хацелася б, каб такіх дзяўчат было больш, тады свет стане прыгажэйшы.

***— Што больш захапляе: далікатнасць жанчыны ці яе ўнутраная сіла?***

— Далікатнасць і вытанчанасць — яе сіла. Яна можа вельмі па-майстэрску, па-жаночаму «скарыстацца» ёй. І, думаю, гэта адбываецца часам неўсвядомлена. Такая класіка ўзаемаадносін паміж мужчынамі і жанчынамі была ўслаўлена яшчэ ў сярэдні вякі. Сучасны свет крыху страціў гэтыя пазіцыі, жанчыны часцей хочуць праяўляць сілу. Я не маю нічога супраць феміністычных настрояў, і выдатна, што жанчыны змагаюцца за свае правы, калі іх ушчамляюць. Але часам у іх дзеяннях бываюць некаторыя перакосы, усё гэта набывае карыкатурныя формы. Лічу, што жанчыны могуць вельмі і вельмі многае, у іх бывае больш патэнцыялу, чым у мужчын. Мне падабаецца, як многія жанчыны рэалізуюць яго ў бізнесе. Пры гэтым застаюцца жаноцкімі і досыць паспяховымі.

***— Чым жанчыны ў бізнесе адрозніваюцца ад мужчын?***

— Прыходзячы на перагаворы з мужчынамі, некаторыя бізнес-лэдзі выкарыстоўваюць «жаночыя» хітрыкі. Напрыклад, вялікае дэкальтэ і флірт. На мой погляд, гэта маветон. Лепш, калі жанчына паводзіць сябе па-дзелавому і адзяваецца на сустрэчу адпаведна. (Хоць мужчыны бываюць розныя, некаторыя нават скрозь закрыты дзелавы касцюм могуць убачыць жанчыну, а не партнёра па бізнесе.) Выкарыстоўваючы «жаночыя» хітрыкі, дамы дамагаюцца на перамовах патрэбнага выніку. Я ведаю мужчын, якія глядзяць на гэта без адабрэння. Яны адразу заўважаюць падобныя прыёмы, і стаўленне да будучага партнёра можа змяніцца ў горшы бок. Лепш усё ж дазволіць у дрэс-кодзе крыху больш пасля афіцыйнай сустрэчы. Напрыклад, калі гэта фуршэт у рэстаране ці вечарына.

***— Пра што маўчаць мужчыны?***

— Пра свае шкілеты ў шафе *(усміхаецца)*. Ні адзін мужчына не захоча гаварыць пра сябе непрыемныя рэчы перад жанчынай, якая яму падабаецца. Зрэшты, наўрад ці і жанчына пажадае гэта чуць.

***— Ці ёсць штосьці, што мужчына ніколі не скажа жанчыне?***

— Калі ён выхаваны, то не скажа антыкамплімент або колкае слова. Ён будзе паважаць сваю сяброўку, спадарожніцу, калегу ці партнёра. Гэта тое, што трэба шырэй прывіваць у нашым грамадстве. Не скажу, што яно сапсаванае, — наша грамадства разнастайнае. Але лепш, каб вакол было больш добрых прыкладаў.

***— Ці змаглі б вы мець на ўтрыманні сваю другую палову? Як да гэтага ставіцеся?***

— Так, я б змог, заробкі цалкам дазваляюць. Калі яна не хоча працаваць, але пры гэтым захапляецца якім-небудзь хобі, буду толькі рады. Але калі жанчына не хоча ні працаваць, ні займацца чымсьці, то гэта сумная гісторыя. Раней, у XIX стагоддзі, мадэль адносін была такая: муж-мецэнат і жонка-палюбоўніца (утрыманка), і гэта лічылася нормай. Сучаснае грамадства па-іншаму глядзіць на такое ўзаемадзеянне. Кожнаму сваё: жанчыне вырашаць, займацца чым-небудзь ці не, а мужчыну — ці будзе яму прыемна з такой жанчынай. Калі гэта задавальняе абодвух — чаму не? Я за тую формулу, дзе абодва развіваюцца аднachasова і раўнамерна, дапамагаюць адно аднаму не адставаць. У гэтым залог працяглых адносін.

***— А што, калі жанчына зарабляе нашмат больш?***

— На нейкім этапе гэта дапускаецца, але пры гэтым мужчына павінен старацца дагнаць жанчыну ў заробку. Гэта наша прырода: мужчына — заваёўнік і здабытчык, а жанчына — аб'ект заваёвы і захавальніца хатняга ачага. Калі яна зарабляе больш, у пары адбываецца замена роляў, і мужчына можа адчуваць сябе некамфортна. Нямала выпадкаў, калі на гэтай глебе адбываецца разрыў у адносінах, прычым у большасці выпадкаў з ініцыятывы жанчыны, што цалкам натуральна. Ідэальна, калі жанчына, зарабляючы больш, захапляе партнёра заняцца чымсьці дадаткова, дапамагае знайсці шляхі дасягнення большага. Гэта толькі ўмацуе іх адносіны.



***— У якую жанчыну можна закахацца з першага погляду?***

— У тую, якая любіць сябе, якая развіваецца і займаецца тым, што ёй па душы. Асабіста мне імпануюць жанчыны адукаваныя, са стрыжнем маральнасці. Добра, калі яна будзе яшчэ і музай для свайго мужчыны. Яна таксама не дапускае ў сваім сэрцы злосць, паводзіць сябе стала і самадастаткова.

***— Людзі часта кажуць словазлучэнне «сапраўдны мужчына», і адразу за гэтым «павінен». Што і каму ён павінен? І як накont «сапраўдных жанчын»?***

— Мужчына сапраўды павінен. Перш за ўсё сабе. Павінен становіцца лепшым у адносінах да сябе ўчарашняга. Павінен забяспечыць родных, аказваць увагу жонцы і дзецям, старацца ўсіх развіваць, захапляць чымсьці і ўзбагачаць духоўна. Жанчына таксама павінна расці над сабой і самаўдасканальвацца. Але ёсць жартаўлівы выраз пра тое, што жанчына нікому нічога не павінна.

***— Галоўнае ў адносінах — гэта...***

— Шчырасць, узаемапавага, жаданне дапамагаць у любой сітуацыі. Падтрымліваць словам і справай.

***— Быць у шлюбе — гэта...***

— ...глядзець у адным кірунку. Глядзець адно на аднаго заўсёды паспее.

**Віталіна БАНДАРОВІЧ.**

Мамін дзённік

# І ПУГА НЕ ВЫЙСЦЕ, І ПЕРНІК НЕ ЦУКЕРКА

**Яшчэ калі Цёмік знаходзіўся ў маім жывоціку і не спяшаўся, хоць была ўжо пара, з'яўляцца на свет, урачы, якія каторы раз адпраўлялі мяне ў радзільню «здавацца», ці то жартам, ці то ўсур'ёз прапаноўвалі папрасіць малога аб хуткай сустрэчы. «Спрабавала, але не слухаецца», — адказвала я ім. «Калі ж ён вас ужо не слухаецца, што ж будзе потым», — гэтыя словы цяпер я прыгадваю ўсё часцей.**

Тады, калі Цёмік не хоча апранацца, калі бруднымі рукамі хапаецца за пячэнне ці абаранак, калі на ўсе мае просьбы не чапаць кошку яшчэ мацней упіваецца сваімі ручкамі ў далікатную поўсць, калі наўмысна вылівае на дыванок кампот і, нягледзячы на ўсе забароны, цягне свае пальчыкі да пральнай машыны, тэлевізара, газавай пліты... Пакуль, нарэшце, не апячэцца і не зальецца слязьмі. Потым некалькі разоў будзе паказваць на пашкоджаны пальчык, па-дзіцячы тлумачыць, як моцна яму баліць, і зграджацца, што больш ні на крок не падыдзе да пліткі. І так пару дзён, а потым зноў стане каля яе круціцца, быццам захоча праверыць сябе на стойкасць.

Такое адчуванне, што для сучасных дзяцей не існуе слова «нельга». Яно нібы чырвоная ануча для іх — так і цягне паглядзець, што за ёй. І сапраўды, чым менш звяртаеш увагі на тое, як дзіця бярэ нешта забароненае, тым яно хутчэй з гэтым расстаецца, прычым па сваёй волі. Але ж не будзеш заплюшчваць вочы, калі малое хапае не схаваны своечасова нож альбо залазіць на табурэт, а пасля на стол, каб узяць з лядоўні цукерку. Не дазволіш яму і выбягаць на дарогу, калі яно ўпарта адмаўляецца даць табе руку.

Шчыра прызнацца, я ўжо не ведаю, як растлумачыць Цёміку, што такое добра, а што — дрэнна. Яму яшчэ і двух гадоў няма, а мне ўжо бывае цяжка з ім спраўляцца. Што не па-ягонаму — енчыць і ўсё роўна робіць па-свойму. Кажуць, што сёння метад пугі і перніка ўжо не працуе. А як тады выхоўваць дзіця, калі яно цябе не чуе?!

Днямі такая алергія ў Цёміка пачалася, што да ацёку Квінке было недалёка. Педыятр пасадзіла на дыету і строга забараніла даваць малому салодкае. А той ужо, як кажуць, пакаштаваў (дзякуй добрым людзям!) ды просіць штодзень, да істэрыкі даходзіць — дай яму цукерку, і ўсё! Муж у камандзіроўцы, кажа, каб я тлумачыла малому, што ад цукерак у яго на шчочках, руках і нагах чырвоныя плямкі, якія свярбяць, перашкаджаюць нармальна кантактаваць з іншымі дзецьмі. Але што тлумачыць двухгадоваму хлопчыку, які не ўсё разумее, калі нават бацька яго ўжо дарослы і ведае, да чаго можа прывесці курэнне, але ж усё роўна не адмаўляецца ад цыгарэт?!

Прызнаюся, ад гэтай сынавай непаслухмянасці часта здаюць нервы. Ён ужо ведае, дзе вісяць папругі, і нават на сабе паказвае, для чаго яны патрэбны, але і гэта праце ненадоўга. А калі Арцёмка ўмудрыцца ўвогуле пляснуць мне па твары, калі яму нешта не падабаецца, раблю выгляд, што сыходжу з дому (сама тым часам дзесьці хаваюся). Ён, канешне, плача, заве мяне, абяцае бабулі, што больш не будзе крыўдзіць маму, але праз некаторы час усё паўтараецца...

У маладых бацькоў, у якіх і па двое, і больш дзяцей, пытаюся, што я раблю не так. І не магу дабіцца канкрэтнай парады: сітуацыя ў нас падобная. Маўляў, расце пакаленне Z і нічога ты з дзіцём не зробіш, застаецца толькі чакаць, пакуль перарасце. Не даб'ешся парады і ад бацькоў. У іх адзін адказ — мы былі іншыя, шкодныя, але бацькоў баяліся, слухаліся. Сапраўды, пакуль некалькі градак не апалю, у кватэры не прыбяру, посуд не памыю, ні пра які паход на дыскатэку не варта было нават заікацца. Страшна падумаць, што магло б быць, калі б я вывернула на падлогу талерку з ежай, якую не хацела есці, альбо ганяла дзеда з крэсла. Помню, як сказала сваёй бабулі «не хадзі як слон» (яна перашкаджала нам з сяброўкай гуляць), дык такога нагоняю ад маці атрымала, што да канца дзён называла бабулю на «вы».

І неяк жа з намі яна спраўлялася, калі мы, чатыры ўнукі, збіраліся ў яе гарадской двухпакаёвай «хрушчоўцы». А на вёсцы ўвогуле ўшасцёх праводзілі не адно лета. Баба з дзедам мала што нас пільнавалі, трэба было дзяцей накарміць (гэта цяпер маленства насы адварочвае, мы ж змяталі ўсё за мілую душу) ды гаспадарку даглядзець. Цёмікаў прадзед (дарэчы, ветэран Вялікай Айчыннай) нядаўна расказваў, як ён дамаўляўся з унукамі, прычым усе былі хлопцы. Не слухаюцца, пакажа дубец — і ўсё ў парадку. Затое нікуды не лезлі і цэлыя дахаты прыязджалі.

А цяпер паспрабуй пакінуць на адну бабулю хоць бы траіх. Адзін толькі Цёмік чаго варты! Нядаўна акурат з'ехаліся да свекрыві — дзіцячы садок адпачывае. Толькі і сачы, каб наш Цёмік і свайго сямігадовага брацікa не пакрыўдзіў, і маленькую Еву, якая яшчэ поўзае, не заабдымаў і не зацалаваў. Бабуля Аліна прызнаецца: наўрад ці пагадзілася б адна глядзець усіх траіх. І я разумею. Тут часам аднаго Цёміка ўсяго на некалькі гадзін пакідаеш (нават з двума — бабуляй Ірай і дзедам Ванем) — увесь час хвалюешся, каб не шкоднічаў, слухаўся іх. І трэба сказаць, калі мяне няма, з імі паводзіць сябе спакайней. Можа, баіцца расчараваць тых, хто на свайго адзінага ўнучка ледзь не моліцца?! Альбо ўсё ж ёсць нейкія пуга ды пернік?..

**Вераніка КАНЮТА.**

# «Для мяне сям'я на першым месцы»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

А яшчэ ў нас у школе была вельмі дастойная сямейная пара настаўнікаў, яны ва ўсім дапамагалі адно аднаму, былі ўважлівыя і клапатлівыя, і я часам марыла: вось бы ў мяне быў муж-настаўнік!

Аднойчы я прыехала дадому ў суботу, раптам грук у дзверы. Адкрываю і бачу: высокі прыгожы хлопец, пытаецца Любоў Леанідаўну, кажу яму, што пакуль мамы няма дома, ён просіць прабачэння і сыходзіць. Пазней убачыла яго ў школе — Ваня вёў фізкультуру і фізіку. І ўсё гэта — толькі з дзесяцігодкай за плячыма. У той час так можна было...

**Іван Захаравіч:** — Я звярнуў увагу на Надзю — прыгожая дзяўчына, але наўрад ці будаваў нейкія планы з першай сустрэчы. Затое калі яна скончыла 10 класаў і збіралася ехаць паступаць у Ленінград, аб чым мне сказала яе мама, раптам пачаў горача раіць ехаць у Мінск, маўляў, бліжэй, а сам ужо скончыў першы курс геафака БДУ.

***— Ну, вядома, жывучы ў адным горадзе, можна і на спатканні бегаць...***

**Н. І.** — Ну, спатканняў і заляцанняў у нас і не было... Як і марыла, паступіла на бібліятэчны факультэт педінстытута. Часам на занятках глядзела ў акно на корпус БДУ з такімі вялізнымі аўдыторыямі і думала: напэўна, дзесьці там Іван на лекцыях. Мы хоць і жылі ў розных рэспубліках, але ў Мінск дабіраліся з адной станцыі, ды яшчэ на перакладных. Аднойчы, памятаю, так стамілася, што ў дарозе заснула і паклала галаву Івану на плячо.

**І. З.** — А я падумаў: якая прыгожая! Вось бы мне такую жонку...

***— Іван Захаравіч, чаму да дзяўчыны не заляцаліся?***

**І. З.** — Па маіх уяўленнях тады, ды і цяпер, калі сустракаешся з дзяўчынай, трэба дарыць ёй кветкі, цукеркі, купляць білеты ў кіно. Для мяне гэта была недазвалальная раскоша. Мама не магла дапамагаць фінансава, даводзілася выжываць на стыпендыю. І я радаваўся, што ёсць магчымасць мець зносіны з Надзяй, хоць рэдка, трымаць яе ў полі зроку.

**Н. І.** — Вось, уяўляеце! А я ж галаву ламала, мучылася: што за загадкавы хлопец? Едзем разам на вучобу, па дарозе ўдзяляе мне максімум увагі: чамадан мой нясе, усім цікавіцца. А прыязджаем у Мінск — некуды знікае. І зусім мне не патрэбныя былі ні кветкі, ні цукеркі, ні кіно! Я была сціплая, не распешчаная дзяўчына.

**І. З.** — У нас на факультэце была ваенная кафедра. І паколькі я быў адзін з найлепшых студэнтаў, накіравалі служыць у Германію. Перад ад'ездам прыехаў дадому, хацеў зрабіць такі настальгічны тур па дарагіх мясцінах. Планаваў і да Надзінай мамы зайсці, падзякаваць, што яна ўзяла мяне на работу.

**Н. І.** — Ваня — да нас, а я — на танцы збіраюся, прыехалі хлопцы са Смаленскага медінстытута! Ваня прыбыў ужо ў вайсковай форме — такі цікавы малады лейтэнант! І вось быў момант, калі мы выпадкова сустрэліся вачыма і прабегла тая самая іскра... Я падумала: ды ну, не можа быць! І, на ўсякі выпадак, пайшла на танцы...



Паэт Іван ЮРКІН.

***— А як Іван Захаравіч адрэагаваў?***

**І. З.** — Паехаў дадому. Кажу сястры: Надзя такая прыемная, добрая дзяўчына. Яна мне адказвае: «Дык ажаніся!» Папрасіў сястру мяне сасватаць!

**Н. І.** — Мама пытаецца, ці згодная я пайсці за Івана, а я, паколькі ўсё так нечакана, нічога не магу вырашыць. Нават расплакалася, ці гэты дзень не ведаю, ад шчасця ці ад засмучэння. Усё ж сказала «так». Чаго ўжо было ўтойваць? Даўно падабаўся, запаў у душу.

***— А быў час распісацца, вяселле справіць?***

**І. З.** — Які час?! Праз некалькі дзён трэба быць у Мінску. Цешча патэлефанавала ў сельсавет, нас «па знаёмстве» распісалі ў той жа дзень. Ехалі мы на матацыкле, як вы разумееце, без усякіх кветак і стужачак. Мы ж нявопытныя, не ведалі, што патрэбныя сведкі. Старшыня сельсавета выклікала качагара і прыбіральшчыцу. Тым не менш, мы адзначылі стварэнне маладой сям'і: у мяне было з сабой шампанскае!

**Н .І.** — Хуценька зладзілі вечар для родных, суседзяў. Але «горка» нам крычалі, вось тады мы ўпершыню і пацалаваліся. А яшчэ Ваня мяне здзівіў букетам пышных гладыёлусаў. Дзе ён іх узяў, не ўяўляю! У нашай вёсцы тады такіх кветак не было. Потым мы пабудавалі свой дом, і кожную вясну я высаджваю гладыёлусы — да гэтага часу мае любімыя кветкі!

**І. З.** — Пасля вяселля мне засталося двое сутак пабыць дома. Для камандавання быў сюрпрыз — з'ехаў халасцяком, вярнуўся жанатым чалавекам. Надзя па размеркаванні паехала працаваць у Пінск. Праз два месяцы быў гатовы для яе выклік, але як толькі яна прыехала, мяне на два месяцы камандзіравалі ў Брандэнбург.

***— Вясёлы пачатак сямейнага жыцця...***

**Н. І.** — Жах. Адна, у чужой краіне, работы няма. Калі Іван вярнуўся, адразу пачала яго «пілаваць»: дзе работа?

**І. З.** — Надзя ўладкавалася ў бібліятэку. Яна вельмі добра ўсё там наладзіла. А мне хацелі падоўжыць службу яшчэ на два гады, таму што ўзвод быў найлепшы. І папракалі: у цябе ж тут жонка працуе! Але я просты хлопец: пабыў у Германіі — і дадому ўжо моцна цягнула.

***— А колькі ўвогуле было пераездаў у вашым жыцці?***

**Н. І.** — Сем. Гэта няпроста. Не дарма ж кажуць: адзін пераезд роўны двум пажарам. Заўсёды трэба было ўладкоўвацца на новым месцы, дзеці школы не раз мянялі. Сядзець дома мне вельмі цяжка маральна, таму кожны пераезд — гэта яшчэ і пошук работы. Думала і пра тое, што трэба і мне зарабляць для сям'і. Дастатку не было, жылі ад зарплаты да авансу.



За дзесяць гадоў вельмі расчаравалася ў бібліятэчнай працы. Хацелася працаваць з людзьмі, а атрымлівалася, што з паперамі. Акрамя знясільваючага, манатоннага апісання кніг, складання каталогаў, ствараеш планы і пратаколы праведзеных мерапрыемстваў для правяраючых.

**І. З.** — Мы шмат перапісваліся, і я бачыў, што ў Надзі вельмі лёгкі стыль. Падумаў, што добра было б ёй працаваць у рэдакцыі. Калі пераехалі ў Крычаў, дзе я служыў начальнікам міжрайаддзела КДБ, патэлефанаваў рэдактару мясцовай газеты, пацікавіўся, ці няма вакансій. Ён даў некалькі заданняў Надзі, яна паспяхова справілася, і яе прынялі на работу.

**Н. І.** — Пісаць артыкулы трэба было і на беларускай мове, да таго ж я разумела, што жыць мы будзем у Беларусі, таму пачала вывучаць мову. Мне не хацелася чымсьці вылучацца сярод калег. А потым і не заўважыла, як пачала не толькі пісаць, але і думаць па-беларуску.

***— Ёсць такі заезджаны сюжэт у фільмах: сямейнае свята або адпачынак, а афіцэра выклікаюць на службу. Жонка ў істэрыцы. А ў жыцці як?***

**І. З.** — Надзя ведала спецыфіку маёй працы і спакойна ставілася да раптоўных выклікаў. Праўда, быў і кур'ёз у самым пачатку маёй службы ў КДБ. Неяк уначы яна зняла трубку хатняга тэлефона, а мне кажа: хтосьці памыліўся нумарам. Пытаюся: што сказалі? Яна адказвае: «Абвешчаны збор». Я хутка, за пяць хвілін сабраўся!

У сям'і галоўнае — давер. У нашым качавым жыцці было так, што я служыў у Беларусі, а Надзя два гады жыла ў Маскве з дзецьмі. Пры гэтым мы заўсёды давяралі адно аднаму, засталіся блізкімі людзьмі, і я сваімі паводзінамі даказваў, што для мяне сям'я на першым месцы.

***— А вы, Надзея Іванаўна, што лічыце галоўным?***

**Н. І.** — Без даверу, узаемапавагі сям'я не адбудзецца. Сям'я — гэта, вядома, вялікая сумесная праца. Перш за ўсё душэўная. Без якіх-небудзь шурпатасцяў немагчыма пражыць, але заўсёды трэба разумець, што галоўнае, што другараднае, а на што і зусім не варта звяртаць увагі.

***— Як выхоўвалі сваіх дачок?***

**І. З.** — Яны раслі ў любові — гэта самае лепшае выхаванне. Дарэчы, вельмі ганаруся, што ў нас менавіта дзяўчынкі.

**Н. І.** — Я думаю, толькі асабістым прыкладам. Дочкі атрымалі адукацыю, працуюць, клапоцяцца аб сваіх сем'ях. У нас вельмі добрыя зяці. І наша галоўнае багацце — шасцёра ўнукаў і ўнучак!

***— Пра вас можна сказаць, што жывяце душа ў душу?***

**Н. І.** — Часам мы заўважаем, што ў нас адны і тыя ж думкі, спадзяванні і клопаты. Калі я аб нечым толькі падумаю, напрыклад, добра было б гэта зрабіць, а Іван уголас кажа: так, трэба! Зробім! Ён умее чытаць мае думкі!

**І. З.** — Так. Але пры гэтым мы можам паспрачацца, не хаваючы эмоцый. І гэта нармальна, у такіх адносінах няма фальшу.

***— У вас вельмі ўтульны дом. Калі адважыліся на будоўлю свайго гнязда?***

**І. З.** — У нас была трохпакаёвая кватэра, але невялікая па плошчы. Калі малодшая дачка выйшла замуж, стала цеснавата. Я разумеў, якія насталі часы: чакаць кватэры ад дзяржавы ўжо неактуальна. Мара жыць у сваім доме, на зямлі, у мяне заўсёды была, і Надзя таксама не пярэчыла. У той час участак зямлі ў вёсцы каштаваў нядорага, і тады мы не меркавалі, што праз 10 гадоў яна ўвойдзе ў рысу Мінска. Давялося і крэдыт браць, і спадчыну пусціць у абарот, але вынік нас радуе. Вельмі дапамаглі зяці, у іх залатыя рукі, імі выкананы амаль усе аздабленчыя работы. Галоўнае, што ім гэта дастаўляе каласальнае задавальненне. А я вось не такі: магу, вядома, памяняць лямпачку або прыбіць палічку, але чым даўжэй жыву, тым менш мне гэта падабаецца.

Калі будаваліся, у вёсцы былі звычайныя дамы, наш здаваўся шыкоўным. Цяпер ён тут самы сціплы, усяго 85 метраў жылой плошчы. А суседзі, якія пабудавалі гмахі па 200-300 квадратаў, скардзяцца, што за ацяпленне плацяць вялікія грошы. Карыстаюцца ж яны прыблізна такой жа плошчай, як і мы, астатняе прастойвае.

**Н. І.** — Для нас гэта райскае месца! Побач вадасховішча, сасновы лес. Ёсць свой невялікі агарод, вырошчваем агуркі, памідоры. Іван зрабіў кармушкі, і кожную зіму ў нас шмат птушак, летам кветкі цешаць вока. А самае галоўнае — унукі прыязджаюць на канікулы. Гэта такое шчасце, калі ўся сям'я ў зборы!

***— Надзея Іванаўна, для вас было нечаканасцю, што Іван Захаравіч пачаў пісаць вершы?***

**Н. І.** — Мне здаецца, ён заўсёды быў паэтам у душы, прычым не сапсаваным цывілізацыяй. На хутар, дзе ён жыў, не правялі святло — не хапіла двух слупоў лініі электраперадачы. У доме няма святла, няма радыё, то-бок хлопчык нават песні паслухаць не можа. Але была прыгожая прырода: шырокая і чыстая рака Бесядзь, бярозавыя гаі, залатыя досвіткі... Ён слухаў журчанне ручаёў, спевы птушак. Таму вершы такія добрыя, музычныя, ідуць з глыбіні душы. Іван і на гармоніку навучыўся граць у 50 гадоў. Я да гэтага часу ў здзіўленні, як, не ведаючы нот, ён разумее, на якую клавішу трэба націскаць!

***— Шмат вершаў вам прысвяціў?***

